Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага і харэаграфічнага мастацтва
Кафедра музычна-тэарэтычных дысцыплін

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_________ Н. І.Дожына
“21” снежня 2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_________ І. М.Грамовіч
“26” снежня 2022 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА

для спецыяльнасці
6-05-0215-03 Харэаграфічнае мастацтва

Складальнікі:
Н.І.Дожына, загадчык кафедры музычна-тэарэтычных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
В.Б.Лойка, дацэнт кафедры музычна-тэарэтычных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства.

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва
26 снежня 2022 г., пратакол № 5.

Складальнікі:
ДОЖЫНА НАТАЛЛЯ ІВАНАЎНА, загадчык кафедры музычна-тэарэтычных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
ЛОЙКА ВОЛЬГА БРАНІСЛАВАЎНА, дацэнт кафедры музычна-тэарэтычных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства.

Рэцэнзенты:
ГАЖЭЎСКАЯ-ПЕШАК ТАЦЦЯНА СТАНІСЛАВАЎНА, дацэнт кафедры харавой музыкі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

Кафедра музычнага мастацтва УА "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацверджання:

Кафедрай музычна-тэарэтычных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 21.12.2022 № 5);

Саветам факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 27.12.2022 № 5).

## ЗМЕСТ


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………….. 4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………… 8
2.1 Змест вучэбнага матэрыяла…………………………………….. 8
2.2 Канспект лекцый…………………………………………....... 12

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………….. 54
3.1 Тэмы семінарскіх заняткаў………..…...…………………... 54
3.2 Заданні для самастойнай работы..……………………….... 58

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ………………………………... 64
4.1 Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці……………… 64
4.2 Рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў ....... 65
4.3 Прыкладныя пытанні да экзамена па прафесійнай педагогіцы… 67

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……….………………………….... 70
5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны……........ 70
5.2 Спіс літаратуры………………………………………………… 71

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне дысцыпліны “Прафесійная педагогіка” з’яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў да практычнай работы ў якасці педагога (трэнера, кіраўніка студыі, харэаграфічнага калектыва), арганізатара мастацка-эстэтычнага выхавання дзяцей і дарослых. Асноўны змест курса складаюць пытанні гісторыі развіцця сістэмы мастацкай (харэаграфічнай) адукацыі, метадалагічныя і тэарэтычныя асновы арганізацыі працэсаў мастацка-прафесійнага выхавання, навучання і развіцця асобы, шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў педагогаў у галіне харэаграфічнага мастацтва.

Прафесійная педагогіка з’яўляецца адгалінаваннем агульнай педагогікі і таму падпарадкоўваецца яе заканамернасцям і прынцыпам, хаця мае і свае, спецыфічныя. Навучальная дысцыпліна “Прафесійная педагогіка” абапіраецца таксама на мастацтвазнаўства, псіхалогію, фізіялогію, эстэтыку і іншыя навукі, якія складаюць яе метадалагічную аснову і вывучаюць заканамернасці развіцця мастацтва і непасрэдна ўплываюць на вызначэнне мэты, задач і зместу курса. Разам з курсамі “Педагогіка”, “Псіхалогія”, “Методыка выкладання”, педагагічнай практыкай прадмет “Прафесійная педагогіка” ўтварае блок дысцыплін, якія забяспечваюць педагагічную падрыхтоўку спецыялістаў да дзейнасці ў сферах культуры і адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

ВМК па прафесійнай педагогіцы – сукупнасць вучэбна-метадычнай дакументацыі, сродкаў навучання і кантролю па прадмеце. Утрымлівае інфармацыю, неабходную для паспяховага засваення зместу дысцыпліны. *Мэтай ВМК* з’яўляецца забеспячэнне адкрытасці адукацыйнага працэсу па прадмеце, стварэнне ўмоў для самастойнай работы студэнтаў і павышэння якасці адукацыйнага працэсу, фарміраванне навукова абгрунтаваных уяўленняў аб заканамернасцях працэсаў мастацка-прафесійнага (харэаграфічнага) выхавання, навучання і развіцця асобы.

*Асноўнымі задачамі ВМК* з’яўляюцца:

- засваенне ведаў з гісторыі станаўлення сістэмы мастацка-прафесійнай адукацыі, тэарэтычных асноў працэсаў харэаграфічнага выхавання, навучання і развіцця асобы;
- фарміраванне асноў педагагічнага майстэрства ў будучых спецыялістаў;
- выхаванне ўстойлівага інтарэсу да прафесіі педагога, імкненне да мастацка-педагагічнай самаадукацыі.

ВМК мае наступны змест: тлумачальная запіска, тэарэтычны раздзел, практычны раздзел, раздзел кантроля ведаў, дапаможны раздзел.

Вы ўводзінах сфармуліраваны мэта, задачы і структура ВМК. Далей размешчаны тэматычныя планы ў аб'ёме, устаноўленымі праграмай і вучэбным планам.

Тэарэтычны раздзел утрымлівае:

- кароткі змест вучэбнага матэрыяла;
- канспекты лекцый.

Практычны раздзел змяшчае вучэбныя матэрыялы для правядзення семінарскіх заняткаў і самастойнай работы:

- тэмы семінарскіх заняткаў;
- заданні для самастойнай работы.

Раздзел кантроля ведаў уключае:

- сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці;
- рэйтынгавая сістэма ацэнкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў па курсу "Прафесійная педагогіка"
- Прыкладныя пытанні да экзамена па прафесійнай педагогіцы.

Дапаможны раздзел змяшчае:

- спіс рэкамендаванай літаратуры: асноўны і дадатковы;
- гласарый.

Дадатак уключае:

- вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне "Прафесійная педагогіка".

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Прафесійная педагогіка" студэнт павінен**:**

– ***ведаць****:*

- асноўныя прафесійна-педагагічныя паняцці і катэгорыі, значэнне прафесійнай педагогікі ў сістэме навук аб чалавеку і грамадстве, аб культуры і мастацтве;
- асноўныя палажэнні сучасных канцэпцый прафесійнай адукацыі асобы, педагагічныя спосабы, метады, тэхналогіі, якія забяспечваюць эфектыўнасць прафесійна-педагагічнага развіцця і самаўдасканалення; сусветныя тэндэнцыі развіцця прафесійнай адукацыі;
- нацыянальную сістэму прафесійнай адукацыі і асаблівасці яе мадэрнізацыі;
- прынцыпы выкарыстання прафесійна-педагагічных ведаў для рашэння асобасных, сацыяльных і прафесійна-педагагічных задач;
- генезіс прафесійна-педагагічных ведаў на розных ступенях развіцця грамадства, гісторыю развіцця беларускай прафесійна-педагагічнай думкі (этапы і персаналіі);

- сістэму прафесійнай адукацыі, сучасныя тэндэнцыі яе развіцця ў Беларусі і замежных краінах;

***– умець:***

- арганізоўваць прадуктыўны прафесійна-педагагічны працэс з рознымі групамі насельніцтва ў сферы хаоэаграфіі;
- улічваць заканамернасці і прынцыпы працэсу прафесійнай адукацыі пры аналізе і здзяйсненні грамадскай і адукацыйнай практыкі;
- выкарыстоўваць тэарэтычныя веды, навуковыя падыходы і крытэрыі прафесійнай адукацыі, тэхналогіі распрацоўкі вучэбных праграм, падручнікаў, вучэбна-метадычнай дакументацыі ў прафесійна-педагагічнай харэаграфічнай практыцы;
- распрацоўваць і рэалізоўваць праекты прафесійнага педагагічнага навучання, выхавання і самаўдасканалення ў працэсе мастацка-творчай дзейнасці;

***– мець навыкі:***

- самастойнага прафесійна-педагагічнага мыслення, неабходнага для паспяховай творчай і педагагічнай дзейнасці;
- выкарыстання ведаў у прафесійна-педагагічнай практыцы ў сферы харэаграфічнага мастацтва;
- прафесійна-педагагічнага самаўдасканалення, прафесійна-педагагічнай творчасці ў галіне прафесійнага, аматарскага і фальклорнага мастацтва.

Вывучэнне навучальнай дысцыпліны «Прафесійная педагогіка» накіравана на фарміраванне *універсальных кампетэнцый*:

– КК-1 Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, ажыццяўляць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі.

– КК-5 Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці.

– КК-6 Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

*базавых кампетэнцый*:

– БПК-1 Ужываць на практыцы асноўныя тэорыі навучання і выхавання, сучасныя педагагічныя сістэмы, разумець іх ролю і месца ў адукацыйным працэсе.

– БПК-2 Вызначаць і ўжываць у прафесійнай дзейнасці сучасныя метады, формы, сродкі і тэхналогіі навучання і выхавання.

– БПК-3 Улічваць ў педагагічнай дзейнасці асаблівасці ўзроставага фізіялагічнага і псіхалагічнага развіцця чалавека на аснове сістэмных ведаў аб

жыццёвых этапах яго развіцця ў біялагічным, сацыяльным і псіхалагічным аспектах.
– БПК-4 Ажыццяўляць педагагічную дзейнасць у сферы мастацкай адукацыі, ствараць і прымяняць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і педагагічныя інавацыі ў мэтах асабістага, духоўна-маральнага, мастацка-эстэтычнага і прафесійнага развіцця навучэнцаў.

Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі па прадмеце “Прафесійная педагогіка” характарызуецца пераасэнсаваннем традыцыйных сродкаў навучання ў кантэксце сучаснай сітуацыі і шырокай прадстаўленасцю сродкаў навучання на грунце лічбавых (электронных) носьбітаў. Выкарыстанне комплексу падчас навучання забяспечвае асэнсаваную і прадуктыўную пазнавальную дзейнасць студэнтаў і эфектыўную арганізацыйна-кіраўніцкую дзейнасць выкладчыка.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне раздзела “Прафесійная педагогіка” вучэбнай дысцыпліны “Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін” усяго прадугледжана 90 гадзін, з якіх 42 гадзіны аўдыторных заняткаў (32 г. лекцыі, 10 г. семінары) на 3 курсе (5 семестр). Вывучэнне дісцыпліны завяршаецца экзаменам, а таксама напісаннем і абаронай курсавой работы (6 семестр).

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Змест вучэбнага матэрыяла

## Раздзел 1. МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПРАФЕСІЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ

***Тэма 1. Уводзіны. Прадмет і асноўныя катэгорыі прафесійнай педагогікі. Мэта, задачы, змест і асноўныя паняцці педагогікі мастацкай адукацыі.***

Месца і роля прафесійнай педагогікі ў сістэме навуковых і вучэбных дысцыплін. Мэта, задачы і змест курса прафесійнай педагогікі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне курса і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.

Метадалагічныя асновы прафесійнай педагогікі: паняцце “прафесійная адукацыя” ў педагагічных даследаваннях; прафесійная адукацыя і адукацыйныя працэсы; аб’ект прафесійнай адукацыі; прафесійная педагогіка і прафесійна-педагагічны працэс.

***Тэма 2. Прафесійная мастацкая адукацыя як цэласны працэс выхавання, навучання і развіцця асобы.***

Педагагічны працэс як адзінства прафесійнага выхавання, навучання, развіцця асобы. Прафесійна-педагагічны працэс як адзінства мэты, задач, зместу, сродкаў, форм і метадаў. Прафесійна-педагагічны працэс як адзінства дзейнасці выкладчыка і навучэнцаў. Заканамернасці і прынцыпы прафесійна-педагагічнага харэаграфічнага працэсу. Агульныя заканамернасці педагагічнага працэсу. Заканамернасці і прынцыпы працэсу харэаграфічнага выхавання. Заканамернасці і прынцыпы працэсу харэаграфічнага навучання. Заканамернасці і прынцыпы працэсу харэаграфічнага развіцця.

Паняцце “харэаграфічная культура асобы”. Структура харэаграфічнай культуры асобы. Змест харэаграфічнай культуры асобы. Мэта і задачы харэаграфічнай адукацыі як ідэальнае ўяўленне аб выніках мастацка-адукацыйнага працэсу. Харэаграфічная адукаванасць як вынік мастацка-адукацыйнага працэсу.

***Тэма 3. Мастацкая адукацыя як сістэма ўстаноў агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі***

Структура сістэмы мастацкай адукацыі. Установы падсістэмы агульнай мастацкай адукацыі. Установы падсістэмы прафесійнай мастацкай адукацыі.

Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сферы мастацкай адукацыі. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

## Раздзел 2. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ МАСТАЦКА-АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

### *Тэма 4. Тэарэтычныя асновы мастацкага (харэаграфічнага) выхавання*

Харэаграфічнае выхаванне чалавека як носьбіта сацыяльных адносін. Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці харэаграфічнага выхавання. Шляхі далучэння асобы да ўспрымання харэаграфічнага мастацтва.

### *Тэма 5. Тэарэтычныя асновы мастацкага (харэаграфічнага) навучання*

Прадмет харэаграфічнай дыдактыкі. Змест харэаграфічнага навучання. Прадстаўленне зместу харэаграфічнага навучання ў нарматыўных дакументах навучальных устаноў.

### *Тэма 6-7. Метады, сродкі, формы мастацка-педагагічнай дзейнасці*

Метады мастацка-педагагічнай дзейнасці. Сродкі мастацка-педагагічнай дзейнасці. Арганізацыйныя формы мастацка-педагагічнай дзейнасці.

### *Тэма 8. Тэарэтычныя асновы мастацкага (харэаграфічнага) развіцця*

Узаемадзеянне сацыяльных і біялагічных фактараў у харэаграфічным развіцці асобы. Праблема музычных і харэаграфічных здольнасцей у навуковых даследаваннях. Паняцце і структура музыкальнасці. Фарміраванне харэаграфічных і музычных здольнасцей. Развіццё харэаграфічных і музычных здольнасцей у розных відах дзейнасці. Дыягностыка харэаграфічных і музычных здольнасцей.

## Раздзел 3. АНТАГЕНЕЗ ХАРЭАГРАФІЧНАЙ І МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

### *Тэмы 9-10. Прадмет і перыядызацыі гісторыі мастацкай адукацыі. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы і сярэдневякоўе да XIV стагоддзя*

Прадмет гісторыі мастацкай адукацыі. Перыядызацыя гісторыі мастацкай адукацыі.Агульная характарыстыка асноўных перыядаў мастацкай адукацыі ў айчыннай гісторыі. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў

старажытныя часы, у сярэдневяковай Еўропе, на беларускіх і рускіх землях да XIV стагоддзя.

***Тэмы 11-12. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпохі Адраджэння і Асветы***

Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV – XVI стст.) і Асветы (XVII – XVIII стст.) у Заходняй Еўропе. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV – XVI стст.) і Асветы (XVII – XVIII стст.) у Расіі. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV – XVI стст.) і Асветы (XVII – XVIII стст.) на беларускіх землях .

***Тэмы 13-14. Харэаграфічная і музычная адукацыя ў XIX – пачатку XX ст. Развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XX ст.***

Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XIX – пачатку XX ст. і ў XX ст. у Заходняй Еўропе, у Расіі, на беларускіх землях. Замежныя сістэмы масавага харэаграфічнага і музычнага выхавання. Замежная педагогіка харэаграфічнай і музычнай адукацыі. Арганізацыя харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў замежных краінах.

## Раздзел 4. МАСТАЦКА-ПЕДАГАГІЧНАЕ МАЙСТЭРСТВА

***Тэма 15. Паняцце, структура і змест мастацка-педагагічнага майстэрства.***

Спецыфіка дзейнасці педагога-музыканта, яго месца і роля ў педагагічным працэсе. Паняцце мастацка-педагагічнага майстэрства. Структура мастацка-педагагічнага майстэрства. Этапы і шляхі фарміравання прафесійна-педагагічнага майстэрства. Змест мастацка-педагагічнага майстэрства. Мастацка-педагагічная навучанасць. Мастацка-педагагічная выхаванасць. Мастацка-педагагічная развітасць.

***Тэма 16. Педагагічная тэхніка як сродак рэалізацыі мастацка-педагагічнага майстэрства***

Майстэрства педагагічнай самарэгуляцыі. Культура педагагічнай працы выкладчыка харэаграфіі. Майстэрства педагагічнага ўзаемадзеяння: стылі педагагічных зносін. Прынцыпы педагогікі супрацоўніцтва і іх рэалізацыя на ўроках харэаграфіі. Кіраванне пазнавальнай дзейнасцю вучняў на ўроках харэаграфіі. Забеспячэнне зваротнай сувязі і кіраванне самастойнай работай

вучняў на ўроку. Кіраванне самастойнай пазакласнай работай вучняў. Прыёмы педагагічнага кантролю і ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў на ўроках харэаграфіі.

## 2.2 Канспект лекцый

Раздзел 1: **МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПРАФЕСІЙНАЙ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ**

**Тэма (лекцыя) 1. Уводзіны. Прадмет і асноўныя катэгорыі прафесійнай педагогікі. Мэта, задачы, змест і асноўныя паняцці педагогікі мастацкай адукацыі.**

Пытанні:
1. Месца і роля педагогікі мастацкай адукацыі ў сістэме навук і вучэбных дысцыплін ВНУ культуры і мастацтваў.
2. Мэта, задачы, змест і асноўныя паняцці педагогікі мастацкай адукацыі.

**1.** *Педагогіка прафесійнай мастацкай адукацыі* – навука аб спецыяльна арганізаваных працэсах, накіраваных на фарміраванне мастацкай культуры асобы як часткі агульнай духоўнай культуры чалавека. Прафесійная мастацкая педагогіка з’яўляецца часткай агульнай педагогікі. Галіны агульнай педагогікі: спецыяльныя (карэкцыйная (дыфекталогія), лагапедыя, прэвентыўная (прафілактычная) педагогіка, алігафрэнапедагогіка, сурдапедагогіка); узроставыя (дашкольная, школьная, сярэдняй і вышэйшай школы, паслядыпломнай адукацыі); дапаможныя (параўнальная, этнічная, сацыяльная, гісторыя педагогікі і інш.; прафесійная (профтэхадукацыі, інжынерная, культурна-асветніцкай работы, бібліятэчная, мастацкая (музычная, харэаграфічная) і інш.)

Прафесійная педагогіка мастацкай адукацыі – галіна агульнай педагогікі, якая падпарадкоўваецца яе заканамернасцям і прынцыпам, але мае і свае спецыфічныя. Для розных відаў мастацтва – музыкі, тэатра, выяўленчага і харэаграфічнага – існуе свая прафесійная педагогіка, якая будуецца на сродках, метадах, тэрміналогіі (прафесійнай мове) таго ці іншага віда мастацтва. Таму, вывучая, галоўным чынам, заканамернасці агульнай прафесійнай мастацкай педагогікі, мы будзем арыентавацца на харэаграфічную спецыфіку.

*Прафесійная мастацкая (харэаграфічная) педагогіка* – навука аб выхаванні, адукацыі і развіцці чалавека сродкамі харэаграфічнага мастацтва і ў працэсе творчай дзейнасці. *Крыніцамі* праф. маст.пед. з’яўляюцца: з аднаго боку педагогіка як навука і як педагагічная практыка (ці як тэорыя і практыка), з другога – мастацтвазнаўства як навука і мастацкая практыка. Прафесійная мастацкая (харэаграфічная) педагогіка звязана і абапіраецца на наступныя навукі і вучэбныя дысцыпліны, якія вывучаюцца ў ВНУ культуры і мастацтва: а) *мастацтвазнаўства*, якое вывучае заканамернасці мастацкай мовы (г.зн. сродкаў выразнасці) і іх уздзеяння на чалавека; вызначае мастацкую каштоўнасць харэаграфічных твораў (кампазіцый, пастановак) і ўплывае на распрацоўку педагаічных метадаў увасаблення зместа ў канкрэтным мастацкім

(харэаграфічным) творы; б) *псіхалогія*, якая вывучае заканамернасці псіхікі чалавека (дзіцяці), развівае іх творчыя і прафесійныя здольнасці; в) *фізіялогія,* якая звязана з асаблівасцямі дзіцячага арганізма, яго функцыянавання, пабудовы, выканальніцкага апарата; г) *эстэтыка*, якая вывучае агульнаэстэтычныя заканамернасці развіцця мастацтва. Менавіта з гэтых навук і дысцыплін прафесійная мастацкая педагогіка запазычыла метадалагічны апарат, ці метадалогію і тэрміналогію.

Дысцыпліна "Прафесійная педагогіка" разам з такімі дысцыплінамі як "Псіхалогія", "Педагогіка", "Методыка выкладання спецдысцыплін", педпрактыка, утрварае блок дысцыплін, якія забяспечваюць педагагічную падрыхтоўку спецыялістаў да дзейнасці ў сістэме мастацкай адукацыі.

**2.** Прызначэнне прафесійнай харэаграфічнай педагогіцы – фарміраванне навукова абгрунтаваных уяўленняў пра заканамернасці працэсаў харэаграфічнага выхавання і навучання, станаўлення і развіцця адукаванай, творчай асобы.

Мэта педагогікі мастацкай адукацыі – фарміраванне навукова абгрунтаваных уяўленняў аб заканамернасцях працэсаў мастацкага выхавання, навучання і развіцця асобы. Задачы:

1) засваенне ведаў з гісторыі станаўлення сістэмы мастацкай адукацыі, тэарэтычных асноў працэсаў мастацкага выхавання, навучання і развіцця асобы;

2) фарміраванне асноў педагагічнага майстэрства ў будучых выкладчыкаў мастацкіх дысцыплін;

3) выхаванне ўстойлівага інтарэсу да прафесіі выкладчыка мастацкіх дысцыплін, імкнення да педагагічнай самаадукацыі.

Аб'ект прафесійнай педагогікі: харэаграфічнае выхаванне і харэаграфічная адукацыя. Прадмет прафесійнай педагогікі: свядома і мэтанакіравана арганізаваны педагагічны працэс, які развіваецца ў часе і ў межах пэўнай выхаваўчай сістэмы ўзаемадзеяння педагогаў і вучняў, накіраванай на пераўтварэнне асобасных уласцівасцяў і якасцяў апошніх пад уздзеяннем харэаграфічнага мастацтва.

Асноўныя паняцці (катэгорыі) курса – прафесійная мастацкая (харэаграфічная) адукацыя, прафесійнае мастацкае (харэаграфічнае) выхаванне, прафесійнае мастацкае (харэаграфічнае) навучанне, прафесійнае мастацкае (харэаграфічнае) развіцце, прафесійна-педагагічнае майстэрства.

Змест курса складаецца з наступных раздзелаў:

1. Метадалагічныя асновы педагогікі мастацкай адукацыі
2. Тэарэтычныя асновы мастацка-педагагічнага працэсу:
2.1Тэарэтычныя асновы мастацкага выхавання асобы
2.2 Тэарэтычныя асновы мастацкага навучання асобы
2.3 Тэарэтычныя асновы мастацкага развіцця асобы
3. Гісторыя мастацкай адукацыі
4. Мастацка-педагагічнае майстэрства выкладчыка мастацкіх дысцыплін

**Тэма (лекцыя) 2. Прафесійная мастацкая адукацыя як цэласны працэс выхавання, навучання і развіцця асобы.**

Пытанні:

1. Прафесійная мастацкая адукацыя як працэс выхавання, навучання і развіцця асобы.
2. Мастацкая адукацыя як вынік мастацка-педагагічнага працэсу.
3. Заканамернасці прафесійна-педагагічнага працэсу.

**1.** *К*ожная навука арганізавана як сістэма ведаў, дысцыплін, частак, з якіх яна складаецца, і мае сваю тэрміналогію – мову, якой апеліруе *метадалогія.* Прафесійная педагогіка вывучае заканамернасці, абгрунтоўвае тэарэтычныя палажэнні, распрацоўвае прынцыпы, метады, формы, тэхналогіі харэаграфічнага выхавання, навучання і развіцця дзяцей і дарослых.

*Прафесійная адукацыя як цэласны працэс* цесна звязана з навучаннем і выхаваннем чалавека. "Адукацыя – гэта тое, што застаецца, калі забыта ўсе вывучанае". Мэта адукацыі – забеспячэнне гарманічнага існавання суб'екта адукацыі (індывід–асоба–чалавек) з акаляючым яго светам (прыродай-грамадствам-духоўнай прасторай).

Мастацка-педагагічны працэс – гэта адзінства выхавання, навучання і развіцця. Мастацкая (харэаграфічная) адукацыя можа разглядацца як мастацка-педагагічны працэс, які складаецца з трох метадалагічных частак – выхавання, навучання і развіцця. Мастацка-педагагічны працэс мае свае мэту, задачы, змест, метады, сродкі і формы. Існуе два полюсы гэтага працэса – гэта выкладанне (з боку выкладчыка, настаўніка, кіраўніка кружка) і вучэнне (з боку навучэнцаў, студэнтаў, школьнікаў). Ўсе мэты, задачы, змест, якія ставіць выкладчык павінны быць накіраваны на вучняў.

Мастацкая культура асобы з'яўляецца часткай агульнай духоўнай культуры асобы. Мэтай мастацка-педагагічнага працэсу з'яўляецца фарміраванне мастацкай культуры асобы як часткі яе духоўнай культуры ў мастацка-педагагічным працэсе. Фарміраванне жа адбываецца праз мастацкую навучанасць, мастацкае выхаванне и мастацкае развіцце, якія прыводзяць да мастацкай навучанасці, выхаванасці, развітасці. Т.ч. вынікам мастацка-педагагічнага працэсу павінна стаць мастацкая адукаванасць асобы. Эрых Фром у філасофскай працы "Мастацтва кахання" пісаў: "Если хочешь наслаждаться искусством, ты д.б. художественно образованным человеком".

**2.**Структура і змест мастацкай адукаванасці складаецца з:
- мастацкай навучанасці, якая убірае у сябе веды, уменні, вопыт у галіне ведаў маст. дзейнасці, вопыт маст. творчасці;
- мастацкай выхаванасці, якая складаецца з: а) мастацка-эстэтычнай свядомасці (г.зн. інтарэсаў, матываў і патрэбнасцей; эстэтычных эмоцый,

перажыванняў;. ідэалаў, густаў, ацэнак, поглядаў, тэорый; б) унутранай актыўнасці асобы – імкнення да пазнання свету (адносіны да грамадства, прыроды, іншых людзей); імкнення да самапазнання, самавыхавання і самаразвіцця;

- мастацкай развітасці, якая ўбірае ў сябе: а) агульныя функцыянальныя механізмы псіхікі – эмацыянальна-пачуццевую сферу; інтэлектуальную сферу; матывацыйна-валявую сферу: сферу падсвяжомага; псіхаматорыку.

б) тыпалагічныя ўласцівасці асобы – мастацкія задаткі, мастацка-эстэтычныя здольнасці, псіхаматорныя мастацкія здольнасці, характар, тэмперамент.

Т. ч. мастацкая адукацыя як вынік мастацка-педагагічнага працэсу – гэта мастацкая адукаванасць у форме мастацкай культуры асобы і трыадзінстве мастацкай навучанасці, выхаванасці, развітасці.

**3.** Заканамернасці – гэта аб’ектыўна істуючыя тэндэнцыі, істотныя сувязі грамадскіх з’яў ці этапы працэсаў, якія паўтараюцца. У дачыненні да прафесійна-педагагічнага працэсу заканамернасці м.б. знешнія і ўнутраныя. *Знешнія:*

*1)* педагагічны працэс у цэлым заканамерна абумоўлены патрэбнасцямі і ўсё ўзрастаючымі магчымасцямі грамадства;

*2)* педагагічны працэс заканамерна залежыць ад патрэбнасцей і рэальных вучэбных магчымасцей суб'ектаў адукацыі;

*3)* эфектыўнасць педагагічнага працэсу заканамерна залежыць ад матэрыяльных, санітарна-гігіенічных, маральна-псіхалагічных, эстэтычных умоў, у якіх ён працякае;

*4)* эфектыўнасць педагагічнага працэсу заканамерна залежыць ад адзінства дзеянняў усіх суб'ектаў адукацыйнага працэсу;

*5)* мэта педагагічнагапрацэсу абумоўлена грамадствам і заканамерна залежыць ад узроставых і іншых асаблівасцей суб'ектаў адукацыйнага працэсу, ад узроўня развіцця калектыва.

*Унутраныя*:

1) у педагагічным працэсе заканамерна ўзаемазвязаны працэсы навучання, выхавання і развіцця, а таксама працэсы адукацыі і самаадукацыі, навучання і саманавучання, выхавання і самавыхавання, педагагічнага кіравання і самадзейнасці навучэнцаў;

2) метады і сродкі педагагічнага працэсу заканамерна абумоўлены яго задачамі і зместам у канкрэтнай сітуацыі;

3) формы арганізацыі педагагічнага працэсу заканамерна абумоўлены яго задачамі, зместам, абранымі метадамі і сродкамі;

4) дасягненне максімальна магчымых у даных умовах вынікаў педагагічнага працэсу за адведзены час заканамерна залежыць ад цэласнага ўліку ўсіх знешніх і ўнутраных узаемасувязей педагагічнага працэсу.

**Тэма (лекцыя) 3. Мастацкая адукацыя як сістэма устаноў агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі**

Пытанні:
1. Структура нацыянальнай сістэмы мастацкай адукацыі. Установы агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі.
2. Асноўныя прынцыпы і характэрныя рысы дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай адукацыі.

**1.** *Структура нацыянальнай сістэмы мастацкай адукацыі* ўключае рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання (міністэрствы адукацыі, культуры, інфармацыі), удзельнікаў адукацыйнага працэсу (навучэнцаў і педагагічных работнікаў), адукацыйныя праграмы, установы адукацыі, арганізацыі , якія здзяйсняюць адукацыйную дзейнасць і г.д. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Адукацыя падзяляецца на *асноўную, дадатковую і спецыяльную*. Асноўная ўключае у сябе ўзроўні дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і навукова-арыентаванай (паслявузаўскай) адукацыі. Дадатковая падзяляецца на наступныя віды: адукацыя дзяцей і моладзі, адукацыя дарослых, адукацыя адораных. Спецыяльная адукацыя рэалізуецца на ўзрознях дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі. Установы асноўнай адукацыі рэалізуюць выкладанне мастацкіх дысцыплін на пачатковым (урокі мастацтва ў дашкольных установах, пачатковай школе) і прафесійным узроўнях (адукацыйныя праграмы прафесійнай мстацкай адукацыі ў педагагічных ССНУ і ССНУ культуры і мастацтва, класічных і педагагічных універсітэтах і ВНУ сферы культуры).

Спосабы і формы адукацыі асобы: інстытуалізаваны спосаб (у навучальных установах у дзённай, вячэрняй, завочнай, дыстанцыйнай формах) і неінстытуалізаваны спосаб (у формах сямейнай мастацкай адукацыі, мастацкай самаадукацыі).

Адукацыйныя праграмы *агульнай мастацкай адукацыі* рэалізуюцца ва ўстановах асноўнай адукацыі на ўзроўнях дашкольнай, школьнай, дадатковай (у т.л. ДШМ), у СМІ, тэатральна-відовішчных арганізацыях і ўстановах, прафесійна-мастацкіх калектывах, грамадскіх арганізацыях. Адукацыйныя праграмы *прафесійнай мастацкай адукацыі* рэалізуюцца ва ўстановах асноўнай адукацыі мастацкага профілю на ўзроўнях сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Да ўстаноў пачатковай прафесійнай мастацкай (харэаграфічнай) адукацыі Беларусі належаць: дзіцячыя школы мастацтваў, вучэбна-педагагічныя комплексы, цэнтры (палацы) як культурна-асветніцкія установы і установы пазашкольнай адукацыі, дзіцячыя студыі і школы пры прафесійных харэаграфічных і музычных калектывах, прадзюсерскіх цэнтрах.

Да ўстаноў сярэдняй прафесійнай харэаграфічнай адукацыі Беларусі належаць: дзяржаўныя каледжы мастацтваў, вучэбна-педагагічныя комплексы: базавая школа-каледж мастацтваў; сярэдняя школа – каледж мастацтваў; гімназія – каледж мастацтваў, дзяржаўныя педагагічныя каледжы.

Да ўстаноў вышэйшай прафесійнай мастацкай адукацыі Беларусі належаць: дзяржаўныя ВНУ сферы культуры і мастацтва, дзяржаўныя ВНУ Міністэрства адукацыі, філіялы дзяржаўных ВНУ, прыватныя ВНУ.

Навукова-педагагічную прафесійную мастацкую адукацыю можна набыць у наступных ВНУ: БДУ культуры і мастацтваў (па навуковых спецыяльнасцях «Мастацтвазнаўства», “Культуралогія”, «Тэорыя, методыка і арганізацыя СКД»), БДАМ («Мастацтвазнаўства (музыказнаўства)), БДПУ імя М.Танка («Тэорыя і методыка музычнай адукацыі»).

Установы прафесійнай мастацкай адукацыі здзяйсняюць адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ў БДУ культуры і мастацтваў (Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў), БДАМ (ФПК), БГПУ (ІПК), абласных і раённых навукова-метадычных цэнтрах (аддзяленні павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў УССА (курсы, семінары, майстар-класы і інш.), на факультэтах і кафедрах Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, Мінскага гарадскога і абласнога Інстытутаў развіцця адукацыі.

**2.** *Асноўнымі прынцыпамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне мастацкай адукацыі* з’яўляюцца:

- абавязковасць пачатковай агульнай мастацкай (харэаграфічнай і музычнай) адукацыі для вучняў агульнаадукацыйнай школы (агульная базавая адукацыя) і дзяцей дашкольных устаноў;
- даступнасць дашкольнай мастацкай адукацыі і на конкурснай аснове мастацкай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;
- пераемнасць і непарыўнасць узроўняў і ступеняў мастацкай адукацыі;
- нацыянальна-культурная аснова мастацкай адукацыі;
- прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, праў чалавека гуманістычнага характара мастацкай адукацыі;
- навуковасць мастацкай адукацыі;
- дэмакратычны характар кіравання мастацкай адукацыяй;
- свецкі характар мастацкай адукацыі.
- даступнасць мастацкай адукацыі;
- шчыльная сувязь мастацкай адукацыі з сістэмай агульнай адукацыі;
- структурная цэласнасць сістэмы мастацкай адукацыі;
- равенства ўсіх грамадзян на атрыманне мастацкай адукацыі;
- дзяржаўны і грамадскі характар пераважнай большасці ўстаноў мастацкай адукацыі;

- адзінства сістэмы мастацкай адукацыі і пераемнасць ўсіх тыпаў мастцкіх навучальных устаноў;
- адзінства нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў засваенні мастацкіх каштоўнасцей, арганічнае спалучэнне ў змесце мастацкай адукацыі інтэрнацыянальнага і нацыянальнага пачаткаў.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (у новай рэдакцыі) увайшоў у дзеянне у 2022 г. (папярэдні - 2011 г.). Згодна Кодэксу стратэгічная мэта ў галіне адукацыі – сфарміраваць якасную сістэму адукацыі, якая адказвае патрэбам і інавацыям эканомікі, інфармацыйнага грамадства. У новай рэдакцыі Кодэкса адлюстраваны наступныя палажэнні:

- скарачэнне і аптымізацыя відаў устаноў адукацыі на ўсіх узроўнях (ухіляюцца Яслі-сад, Класічны ўніверсітэт, вышэйшы каледж);
- формы атрымання адукацыі: памяншэнне вячэрняй (вочнай), завочнай, увядзенне самастойнай – дыстанцыйнай формы ("Палажэнне аб дыстанцыйнай форме ў вышэйшай адукацыі", зацв. Мінадук. РБ). Для профілю "мастацтва і гуманітарныя навукі" спецыяльнасці "харэаграфічнае, музычнае і тэатральнае мастацтва" (і спецыяльнасці 6-05-0215-02 харэаграфічнае мастацтва) дыстанцыйная форма не прадугледжаная.

Патрабаванні да педагагічных працоўных (ст. 51 Кодэкса). Педагогамі не могут быць:

- пазбаўленыя права займацца педагагічнай дзейнасцю;
- маючыя судзімасць;
- прызнаныя недзеяздольнымі або маючыя абмежаванні дзеяздольнасці;
- маючыя медыцынскія супрацьпаказанні да ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці.

## Раздзел 2. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ МАСТАЦКА-АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

### *Тэма (лекцыя) 4. Тэарэтычныя асновы мастацкага (харэаграфічнага) выхавання*

Пытанні:
1. Мэта і задачы мастацкага (харэаграфічнага) выхавання.
2. Заканамернасці і прынцыпы мастацкага (харэаграфічнага) выхавання.
3. Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці мастацка-эстэтычнага выхавання асобы.
4. Шляхі далучэння асобы да ўспрымання мастацтва.

**1.** Мастацка-эстэтычнае выхаванне – гэта працэс фарміравання эстэтычных, мастацка- эмацыянальных адносінаў да мастацтва і рэчаіснасці.

Мэта мастацкага (харэаграфічнага) выхавання – фарміраванне выхаванасці як часткі мастацкай культуры асобы. Галоўны крытэрый эстэтычнай выхаванасці – духоўнасць асобы, яе імкненне да прыгажосці і дабра, праўды і справядлівасці, да творчасці. Асноўныя задачы эстэтычнага выхавання:

- ❑ выхаванне эстэтычных адносінаў да рэчаіснасці;
- ❑ выхаванне здольнасці ўспрымаць прыгожае ў мастацтве, прыродзе, працы і жыцці;
- ❑ фарміраванне мастацка-эстэтычнай культуры, свядомасці, ідэалаў, густаў, пачуццяў, ацэнак.

Вынік мастацкага (харэаграфічнага) выхавання – мастацкая (харэаграфічная) выхаванасць асобы ў адзінстве мастацка-эстэтычнай свядомасці і ўнутранай актыўнасці. Структура мастацкай (харэаграфічнай) выхаванасці ўключае:
1) элементы мастацка-эстэтычнай свядомасці чалавека, да якой адносяцца:
а) інтарэсы, матывы і патрэбнасці; б) эстэтычныя эмоцыі, перажыванні, пачуцці;
в) мастацка-эстэтычныя ідэалы, густы, ацэнкі, погляды, перакананні;
2) элементы ўнутранай актыўнасці асобы, да якой адносяцца:а) адносіны да грамадства, імкненне да пазнання свету, прыроды, іншых людзей; б) імкненне да самапазнання (адносіны да сябе); в) самавыхаванне.

Сродкам фарміравання культурна-асобаснага строя чалавека, якасці якога праяўляюцца ў сукупнасці яго адносінаў да грамадства, культуры, прыроды, да іншых людзей і самога сябе, з’яўляецца мастацтва. Мастацтва – форма грамадскай свядомасці, шлях спасціжэння духоўнага вопыту чалавецтва. Яно адлюстроўвае рэчаіснасць у форме мастацкіх вобразаў і гэтым адрозніваецца ад іншых форм грамадскай свядомасці – ад навукі, рэлігіі, маралі, права, палітыкі.

Мастацкі вобраз у мастацкіх (харэаграфічных) творах :

- ❑ слыхавы (візуальны, пластычны) вобраз канкрэтных жыццёвых з’яў;
- ❑ у мастацтве вобраз мае пэўную ступень абстрактнасці і абагульненасці, жыве ў часе і ўздзейнічае на розум і волю слухача праз яго эмацыянальную сферу;

- мастацкаму вобразу ўласціва адзінства аб’ектыўнага і суб’ектыўнага, эмацыянальнага і рацыянальнага, агульнага і адзінкавага, тыповага і асаблівага.

**2.** Педагогіка мастацкай адукацыі вывучае заканамернасці працэсаў мастацкага выхавання, навучання і развіцця з мэтай удасканалення іх зместу і метадаў.
Заканамернасці – гэта аб’ектыўна існуючыя тэндэнцыі, істотныя сувязі грамадскіх з’яў ці этапы працэсаў, якія паўтараюцца. Яны рэгулююць дзейнасць людзей, адлюстроўваюць яе змест і характар, станаўленне, функцыянаванне і развіццё з’явы ці працэса ў цэлым. Заканамернасці з’яўляюцца пэўным вынікам абагульненага пазнання ўзнікнення, развіцця і функцыянавання сацыяльных сфер і інстытутаў, у тым ліку і сістэмы мастацка-эстэтычнага выхавання.

*Заканамернасці працэсу мастацкага выхавання:*

- працэс выхавання арганічна звязаны з працэсамі навучання і развіцця, якія ўсе разам ўтвараюць цэласны працэс адукацыі чалавека;
- працэс выхавання заканамерна звязаны з працэсам самавыхавання;
- выхаваўчыя ўздзеянні на асобу носяць цэласны (сістэмны) характар і гарманічна ўзгоднены паміж сабой;
- выхаванне здзясняецца ў адзінстве духоўнага і практычнага ўздзеяння на асобу ў адзінстве слова і справы;
- у выхаванні забяспечваецца супадзенне знешніх уздзеянняў на асобу і яе ўнутранай актыўнасці;
- накіраванасць, мэта, задачы і змест выхавання адпавядаюць асноўным прынцыпам дзяржаўнай палітыкі ў галіне выхавання падрастаючага пакалення;
- выхаваўчыя уздзеянні на асобу носяць комплексны характар, што праяўляецца:

1/ у комплексным выхаваўчым ўздзеенні на ўсе сферы індывіда - інтэлектуальную, эмацыянальна-валявую, фізічную;
2/ у адзінстве мэты, задач, дзеянняў усіх суб'ектаў выхаваўчага працэсу (педагагічнага і вучэбнага калектываў, грамадскіх арганізацый, сям'і, саміх навучэнцаў);
3/ у адзінства, гармоніі, узгодненасці іх педагагічных намаганняў;
4/ у комплексным выкарыстанні вербальных і невербальных форм і метадаў уздзеяння на асобу;

- выхаваўчы працэс мае аптымістычную накіраванасць; у выхаванні забяспечваецца апора на станоўчае ў навучэнцах; мэта і задачы выхаваўчага працэсу адпавядаюць інтарэсам і патрэбнасцям навучэнцаў, прымаюцца, усведамляюцца імі і супадаюць з іх намаганнямі.

*Прынцыпы мастацкага выхавання* – зыходныя палажэнні, якія адлюстроўваюць агульныя заканамернасці працэсу выхавання. Існуюць агульныя і спецыфічныя прынцыпы. Агульныя прынцыпы: сувязі выхавання з жыццём, адзінства свядомасці і паводзін, выхавання ў працы і калектыве, спалучэння педагагічнага патрабавання з ініцыятывай і самадзейнасцю навучэнцаў, павагі да асобы і патрабавальнасці да яе, адзінства дзеянняў і пераемнасці ў выхаванні, апоры на станоўчае ў чалавеку. Спецыфічныя прынцыпы (адлюстроўваюць спецыфіку мастацтва як формы грамадскай свядомасці і мастацка-творчай дзейнасці): мастацкай вобразнасці (г.зн. патрабаванні арганізацыі зносін з

мастацкім творам і арганізацыі навучання з апорай на эмацыянальна-пачуццёвую сферу асобы праз яе эмацыянальнае і сенсорнае развіццё); творчай актыўнасці педагога і вучняў; апоры на інтарэс, як вядучы матыў і стымул творчай дзейнасці, што забяспечвае навучанне без прымусу ў атмасферы станоўчага эмацыянальнага фона; апоры на жыццёвы і мастацкі вопыт навучэнцаў; адзінства эмацыянальнагаі рацыянальнага ў развіцці асобы; адзінства мастацкага і тэхнічнага ў працэсе мастацкага навучання; сістэматычнага, комплекснага і паслядоўнага развіцця мастацкіх здольнасцей.

**3.** Мастацтва – сродак фарміравання эстэтычнай свядомасці, духоўнага свету, агульнай мастацкай культуры асобы як часткі духоўнай культуры чалавека. Духоўны свет асобы складаюць: рацыянальная сфера, эмацыянальна-пачуццёвая, валявая, сфера падсвядомага, механізмы інтуіцыі, уяўлення. Мастацтва з'яўляецца сродкам развіцця ўсіх псіхалагічных уласцівасцей чалавека – і розуму, і волі, але перш за ўсё – эмацыянальна-пачуццёвай сферы. Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці мастацка-эстэтычнага выхавання асобы разглядаліся наступнымі навуковымі накірункамі: (галоўны крытэрый – што на першым месцы ў мастацка-эстэтычным выхаванні):
- *інтэлектуалізм* – (ад "інтэлект" – Г.Гегель і яго "сусветны розум" як аснова філасофскай сістэмы);
- *эматывізм* (ад "эмоцыя" – Б.Спіноза і асэнсаванне прыроды чалавека на аснове аналізу яго пачуццяў);
- *валюнтарызм* (ад "воля" – А.Шапенгаўэр і яго "сусветная воля" як усеагульны рухавік прагрэсу).

Выхаваны чалавек – той, што мае добрае выхаванне, умее весці сябе – мае добрыя манеры, уменні, мову, думкі, якія адлюстроўваюць унутраную культуру чалавека. Крытэрыямі выхаванасці дзяцей з'яўляюцца:
1. Знешні выгляд
2. Мова (без жаргона, правільныя моўныя выразы)
3. Рэакцыя на сацыяльныя з'явы (адэкватная)
4. Якаснасць дзейнасці (вучэбнай, пазнавальнай)
5. Узаемадзеянне з іншымі людзьмі

Самавыхаванне – самасвядомая, мэтанакіраваная дзейнасць чалавека па ўдасканаленню сваіх станоўчых якасцей характара і пераадоленню адмоўных. Кампаненты самавыхавання: А) самааналіз Б) самаадзнака В) самаадказ (рус. – самоотчет) Г) самакантроль. Прыёмы самавыхавання: самаадабрэнне і самаабадрэнне; самаабуджэнне (рус. - внушение); самазаахвочванне (рус. – поощрение); саманаказанне и самапакаранне.

**4.** Варыянты ўзаемадзеяння чалавека з творамі мастацтва:
- цэласнае ўспрыняцце і асэнсаванне мастацкіх вобразаў,
- мастацтва як сродак актывізацыі працоўнай (фізічнай ці разумовай) дзейнасці,
- мастацтва як фон, як пэўнае асяроддзе, у якім знаходзіцца чалавек.

Характар успрымання твораў мастацтва можа быць *цэласным* і *спадарожным.* Формы далучэння да мастацтва: *арганізаваныя, самастойныя, стыхійныя.*

*Арганізаваныя* формы далучэння асобы да цэласнага ўспрымання твораў мастацтва :

- урокі мастацтва ў дашкольных і агульнаадукацыйных школьных установах,
- мэтанакіраванае, сістэматычнае наведванне канцэртаў, музычных спектакляў і лекторыяў,
- дзейнасць музычных школ, школ мастацтваў, аматарскіх музычных калектываў і студый, якія працуюць у сферы вольнага часу ў культурна-асветных і пазашкольных установах,
- рэгулярныя заняткі мастацтвам і інш.

*Самастойнае* далучэнне асобы да цэласнага ўспрымання мастацтва:

- самастойнае ацэніванне твораў мастацтва,
- самастойнае ацэніванне падзей у мастацтве,
- чытанне кніг, артыкулаў і рэцэнзій па праблемах мастацтва,
- прагляд і праслухоўванне тэле- і радыёпраграм.

*Стыхійнае* далучэнне асобы да цэласнага ўспрымання музыкі – гэта безсістэмныя і хаатычныя зносіны чалавека з творамі мастацтва.

*Арганізаванае* далучэнне асобы да спадарожнага ўспрымання мастацтва адбываецца на прамысловых прадпрыемствах, у навучальных установах, у медыцынскіх установах. *Самастойнае* далучэнне да спадарожнага ўспрымання мастацтва – гэта самастойны і свядомы выбар твораў, мастацкіх тэле- і радыёперадач для суправаджэння выконваемай працы. *Стыхійнае* далучэнне да спадарожнага ўспрымання мастацтва – выпадковыя музычныя і шумавыя (вытворчыя, вулічныя, бытавыя) гукавыя ўздзеянні на чалавека.

## Тэма (лекцыя) 5: Тэарэтычныя асновы мастацкага (харэаграфічнага) навучання

Пытанні:

1. Прадмет мастацкай дыдактыкі. Заканамернасці і прынцыпы мастацкага навучання.
2. Мэта і задачы мастацкага навучання.
3. Змест мастацкага навучання і яго прадстаўленне ў нарматыўных дакументах і вучэбнай літаратуры.

**1.** *Мастацкая дыдактыка (тэорыя мастацкага навучання)* – галіна прафесійнай педагогікі, якая забяспечвае навуковае абгрунтаванне зместу навучання, аналіз і абагульненне перадавога педагагічнага вопыту, укараненне ў практыку найбольш эфектыўных метадаў, прыёмаў і арганізацыйных форм навучання. Асноўныя катэгорыі мастацкай дыдактыкі: навучанне, выкладанне, вучэнне, вучэбны працэс,

вучэбны прадмет, змест навучання, сродкі навучання, метады навучання, арганізацыйныя формы навучання.

*Мастацкае навучанне* – мэтанакіравана арганізаваны працэс засваення мастацкіх і агульнавучэбных ведаў, уменняў і навыкаў, вопыту мастацка-творчай дзейнасці пад кіраўніцтвам выкладчыка.

*Заканамернасці працэсу навучання*:

- у працэсе навучання заканамерна звязаны працэсы выкладання і вучэння, дзейнасць выкладчыка і дзейнасць вучняў; працэсе навучання заканамерна звязаны яго элементы -мэта, задачы, змест, сродкі, метады, формы;
- мэта навучання заканамерна выцякае з мэты педагагічнага працэсу і:

1/ абумоўлена грамадскімі патрэбнасцямі і рэальнымі вучэбнымі магчымасцямі навучэнцаў;

2/ залежыць ад узроўня і тэмпаў развіцця грамадства, ад яго магчымасцей;

3/ ад узроўня развіцця і магчымасцей педагагічнай навукі і практыкі;

4/ ад тэмпаў сацыяльнага і навукова-тэхнічнага прагрэсу, матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых (эканамічных) магчымасцей навучальных устаноў; задачы навучання заканамерна залежаць ад мэты;

-толькі гарманічная ўзаемасувязь усіх кампанентаў навучання забяспечвае дасягненне вынікаў, якія адпавядаюць пастаўленай мэце.

*Дыдактычныя прынцыпы* – зыходныя палажэнні, якія адлюстроўваюць заканамернасці навучання. *Агульнадыдактычныя прынцыпы* - накіраванасці навучання на комплекснае вырашэнне задач навучання, выхавання і развіцця; навуковасці; сістэматычнасці; даступнасці; паслядоўнасці; сувязі навучання з жыццём, інтарэсамі навучэнцаў; нагляднасці; рацыянальнага спалучэння сродкаў, метадаў і форм навучання; свядомасці, актыўнасці і самастойнасці навучэнцаў; трываласці ведаў, уменняў і навыкаў і інш. *Спецыфічныя прынцыпы* мастацкага навучання: мастацкай вобразнасці; адзінства эмацыянальнага і свядомага (рацыянальнага); адзінства мастацкага і тэхнічнага; комплекснага і паслядоўнага развіцця музычных здольнасцей; нацыянальна-культурнай асновы музычнага навучання; апоры на музычныя інтарэсы вучняў; узаемасувязі мастацтваў; узаемасувязі розных відаў музычнай дзейнасці; апоры на эмацыянальнасць музычных уздзеянняў; развіцця інтарэсу і любві да музыкі праз актыўнае музіцыраванне навучэнцаў; навучання музычнай мове як уменню ўспрымання музыкі; развіцця музычнага ўспрымання ў руху: а) ад жывога музіцыравання да тэарэтычных абагульненняў і вывадаў, б) ад вуснай музычнай мовы да пісьмовай, в) ад назапашвання музычных уражанняў да іх асэнсавання, аналіза і маральна-эстэтычнай ацэнкі; творчай актыўнасці і самастойнасці вучняў; сувязі с жыццём; міжпрадметных сувязей; сістэмнасці; цэласнасці.

**2.**Мэта – ідэальнае мысленае прадугаданне выніку дзейнасці. *Мэта мастацкага навучання* – фарміраванне мастацкай навучанасці і засваенне назапашанага ў грамадстве вопыту мастацка-творчай дзейнасці. Мастацкая навучанасць складаецца з наступных кампанентаў: веды, уменні і навыкі,

вопыт у галіне ведаў мастацкай дзейнасці, вопыт мастацкай творчасці. <u>*Дыдактычныя задачы*</u> мастацкага навучання: 1) засваенне мастацкай дзейнасці (г.зн. мастацкія веды, мастацкія ўменні і навыкі, вопыт у галіне відаў мастацкай дзейнасці, вопыт мастацкай творчасці, мастацкая спадчына (опус-культура) і 2) засваенне вучэбнай дзейнасці (г.зн. агульнавучэбныя веды, агульнавучэбныя ўменні і навыкі, вопыт вучэбнай творчай дзейнасці).

**3.**<u>*Змест мастацкага навучання –*</u> гэта педагагічна пабудаваны мастацкі і духоўны вопыт чалавецтва, адлюстраваны ў вучэбных планах, праграмах, падручніках і дапаможніках, хрэстаматыях і мастацкім вучэбным рэпертуары. *Структура зместу* мастацкага навучання ўбірае ў сябе:

*А) Мастацкія веды* – як аснова авалодання мастацкімі уменнямі і навыкамі; як крытэрый эстэтычнай ацэнкі твораў мастацтва; як крытэрый эстэтычнай ацэнкі розных відаў мастацкай дзейнасці (выканальніцкай, асветніцкай, кампазітарскай, мастацка-педагагічнай інш.).

Б) *Мастацкія ўменні* – гэта здольнасць навучэнцаў выкарыстоўваць мастацкія веды ў розных відах мастацкай дзейнасці. Этапамі фарміравання мастацкіх уменняў з’яўзляюцца: а) этап засваення, асэнсавання, замацавання мастацкіх ведаў, мастацкага вопыту, неабходнага для фарміравання мастацкіх уменняў; актывізацыі назапашанага раней мастацкага і жыццёвага вопыту; б) этап арганізацыі засваення новых мастацкіх уменняў у канкрэтных відах мастацкай дзейнасці пад кантролем выкладчыка; в) этап замацавання і паглыблення фарміруемых умення у разнастайных відах мастацкай дзейнасці з паступовым павелічэннем долі самастойнай работы навучэнцаў. Асноўныя ўзроўні сфарміраванасці мастацкіх уменняў (характарызуюць ступень актыўнасці навучэнцаў, свабоду і самастойнасць выкарыстання фарміруемых уменняў у розных відах мастацкай дзейнасці): а) рэпрадуктыўны – здольнасць дакладна паўтарыць прапанаваны выкладчыкам спосаб дзейнасці ў канкрэтных умовах; б) эўрыстычны – здольнасць выкарыстоўваць атрыманыя мастацкія веды па ўзору ў тыповых сітуацыях пад кантролем выкладчыка і самастойна; в) творчы – самастойнае выкарыстанне мастацкіх ведаў навучэнцамі ў новых незнаёмых сітуацыях сачынення, выканання, успрымання музыкі.

*В) Мастацкія навыкі* – гэта даведзеныя да аўтаматызму мастацкія ўменні. Алгарытм фарміравання мастацкіх навыкаў: 1) атрыманне навучэнцам пры нараджэнні мастацкіх задаткаў (прыродная аснова мастацкай дзейнасці); 2) развіццё на іх аснове пад уплывам сацыяльных фактараў і ўласнай актыўнасці навучэнцаў мастацкіх здольнасцей; 3) засваенне навучэнцамі мастацкіх ведаў; 4) фарміраванне на іх аснове мастацкіх уменняў; 5) фарміраванне і развіццё мастацкіх навыкаў як умовы асваення навучэнцамі на высокім узроўні разнастайных відаў мастацкай дзейнасці.

*Г) Нацыянальная і агульначалавечая мастацкая спадчына* (опус-культура), якая складаецца з:

1) мастацкія творы, якія складаюць педагагічны рэпертуар (народная музыка, класіка, сучасная музыка; творы свецкай, рэлігійнай народнай накіраванасці);

2) прыклады высокамастацкага ўвасаблення чалавечых пачуццяў і думак у творах мастацтва;

3) ўзоры прафесійнага, наватарскага выкарыстання сродкаў мастацкай выразнасці, элементаў мовы мастацтва для ўвасаблення разнастайных мастацкіх вобразаў, для паказу дынамікі іх развіцця і ўзаемадзеяння;

4) мастацкія творы як увасабленне паняццяў дабра і зла, прыгожага і брыдкага, свабоды, веры, надзеі, кахання;

5) мастацкія творы як сродак фарміравання і развіцця духоўных, чалавечых якасцей навучэнцаў;

6) мастацкія творы як шлях набыцця навучэнцамі вопыту эмацыянальна-маральных адносін да рэчаіснасці.

Крытэрыямі сацыяльнай вартасці твораў мастацтва з’яўляюцца: сцвярджэнне нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, садзейнічанне фарміраванню высокіх грамадзянскіхі маральных якасцей, арыгінальнасць і высокі мастацкі і эстэтычны ўзровень. Крытэрыі адбору мастацкага рэпертуару: мастацка-эстэтычны, мастацка-псіхалагічны, мастацка-педагагічны.

Прадстаўленне зместу мастацкага навучання адбываецца ў наступных *нарматыўных дакументах і вучэбнай літаратуры*:

1) вучэбна-метадычная дакументацыя:
- адукацыйныя стандарты,
- вучэбныя планы,
- вучэбныя праграмы,
- вучэбна-метадычныя указанні, рэкамендацыі,
- вучэбна-метадычныя комплексы.

2) вучэбная літаратура:
- падручнікі,
- дапаможнікі,
- рэпертуарныя спісы,
- фонахрэстаматыі,
- зборнікі інструктыўных матэрыялаў,
- зборнікі педагагічнага рэпертуару.

## Тэмы (лекцыі) 6-7. Метады, сродкі і формы мастацка-педагагічнай дзейнасці

Пытанні:

1. Метады мастацка-педагагічнай дзейнасці.
2. Сродкі мастацка-педагагічнай дзейнасці.
3. Формы мастацка-педагагічнай дзейнасці.

**1.**<u>*Метады*</u> – спосабы ўзаемазвязанай дзейнасці выкладчыка і вучняў, накіраваныя на вырашэнне задач навучання, выхавання і развіцця вучняў. Класіфікацыя метадаў – гэта працэс іх упарадкавання па пэўнай прыкмеце.

Метады навучання:

1) метады навучання – метады фарміравання і развіцця спецыяльных і агульнавучэбных ведаў, уменняў і навыкаў, самастойнай работы, уменняў кіравання сваёй дзейнасцю і здзяйснення кантроля і самакантроля, уменняў аналізаваць яе вынікі;

2) метады выхавання – метады фарміравання светапогляду, грамадска карысных матываў дзейнасці, патрэбнасцей, перакананняў, ідэалаў і густаў;

3) метады развіцця – метады развіцця матываў дзейнасці, эмацыянальна-пачуццёвага ўспрымання, тэарэтычнага і эмпірычнага мыслення, агульных і спецыяльных здольнасцей.

Да класіфікацыі метадаў мастацка-педагагічнай дзейнасці існуе комплексны дзейнасна-працэсуальны падыход і выдзяляюцца наступныя групы метадаў:

- <u>*метады стымулявання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці*</u>: - метады фарміравання і стымулявання інтарэсу да вучэння (метады пазнавальнай гульні, вучэбнай дыскусіі, дыспуту, дыялога, эмацыянальнага стымулявання, метад апоры на жыццёвы вопыт, стварэнне сітуацый навізны, займальнасці і інш.);

- метады фарміравання і стымулявання абавязку і адказнасці ў вучэнні (метады заахвочвання і пакарання, пераканання, прад'яўлення вучэбных патрабаванняў, практыкавання і прывучэння да выканання патрабаванняў і інш.). Да метадаў стымулявання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці таксама належаць метад эмацыянальнага ўздзеяння, метад стварэння эфекта здзіўлення, метад заахвочвання і стварэнне сітуацыі поспеху, метад гульнёвых сітуацый, метад дыскусій, метад параўнання, пазнавальныя (дыдактычныя) гульні, метад эмацыянальнай драматургіі, метад экскурсій, метад "назірання за мастацтвам, а не навучанне яму" , метад "не навязвання мастацтва, а пераканане ім" (метад стварэння радаснага настрою ў навучанні, а не пераўтварэнне ўрока мастацтва ў забаву), пабуджэнне да суперажывання, эмацыянальнай чуласці на прыгожае і брыдкае ў акаляючым свеце, пераканання ў працэсе фарміравання эстэтычнага ўспрымання і густу і іншыя.

- <u>*метады арганізацыі і здзяйснення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці:*</u> (вучэбных дзеянняў і аперацый):

- *перцэптыўныя метады*:

- славесныя – метады славеснай перадачы і слыхавага ўспрымання вучэбнай інфармацыі (лекцыя, расказ, гутарка, тлумачэнне, інструктаж і інш.);
- наглядныя – метады нагляднай перадачы і зрокавага ўспрымання вучэбнай інфармацыі (ілюстрацый, дэманстрацый, паказаў і інш.);
- аўдыавізуальныя метады (спалучаюць славесныя і наглядныя прыёмы і метады);
- практычныя – метады перадачы вучэбнай інфармацыі ў працэсе практычных, працоўных дзеянняў і тактычнага, кінестычнага яе ўспрымання (практыкаванняў, выканання практычных заданняў, правядзення вопытаў, працоўных дзеянняў, работы за музычным інструментам і інш.).
- *лагічныя метады* (метады арганізацыі і здзяйснення лагічных аперацый):
- індукцыі (забеспячэнне руху думкі ад прыватнага да агульнага);
- дэдукцыі (забеспячэнне руху думкі ад агульнага да прыватнага.);
- аналітычныя і сінтэтычныя метады (выдзяленне галоўнага і істотнага, класіфікацыі, аналогій, абагульнення, сістэматызацыі, канкрэтызацыі, мадэлявання і інш.).
- метад параўнання
- метад мастацкага абагульнення
- метад кантрастных супастаўленняў
- метад жанрава-стылявога спасціжэння мастацтва
- *гнастычныя метады* (метады арганізацыі і здзяйснення мысліцельных аперацый):

тлумачальна-ілюстратыўныя, рэпрадуктыўныя, эўрыстычныя (часткова-пошукавыя), праблемныя, даследчыя, творчыя (гульнявыя);

- *метады самастойнай работы, у т.л. пад кіраўніцтвам выкладчыка:*

самастойнай работы вучня з кнігай, над клавірам, партытурай музычнага твора, інструктыўным матэрыялам і г.д.; самастойная пісьмовая работа вучняў; самастойная практычная работа; самастойнае выкананне творчых заданняў; самастойная работа за кампьютэрам і інш.

- *метады кантроля і самакантроля за эфектыўнасцю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці*: вуснага кантроля – індывідуальнага і франтальнага апытання, вусных залікаў і экзаменаў; пісьмовага кантроля – кантрольных пісьмовых работ, пісьмовых залікаў і экзаменаў; практычнага кантроля – адкрытых урокаў, практычных паказаў, акадэмічных канцэртаў, тэхнічных залікаў; машыннага – у класах праграміраванага навучання, з дапамогай кампьютэрнага тэсціравання.

Крытэрыі ацэнкі вучэбнай дзейнасці вучняў: праяўленне ведаў і навыкаў падчас выканання твораў; эмацыянальнасць і свядомасць у адносінах да мастацтва; адпаведнасць характара выканання характару твора; праяўленне інтарэсу да мастацтва; эмацыянальны водгук на мастацтва; актыўнасць вучня ў вырашэнні праблемных сітуацый; уменне карыстацца ключавымі ведамі пры ўспрыманні мастацтва; дынаміка росту выканальніцкіх навыкаў; актыўнасць вучня на ўроках.

Крытэрыі ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў: па мастацкіх дысцыплінах: майстэрства ўвасаблення ідэйна-мастацкага вобраза твора; якасць пастаноўкі, інструментоўкі, аранжыроўкі; выканальніцкае майстэрства, валоданне рознымі відамі выканальніцкай тэхнікі; узровень складанасці праграмы ці асобнага твора; ступень эмацыянальна-валявога ўздзеяння на гледача (слухача); артыстызм і сцэнічная культура.

**2.**_Сродкі навучання_ (сродкі педагагічнай дзейнасці) – у вузкім сэнсе – гэта аб’екты, якія выступаюць у якасці інструментаў вырашэння педагагічных задач. Бываюць:

- *друкаваныя сродкі навучання* (падручнікі, дапаможнікі, хрэстаматыі, зборнікі рэпертуара і інструктыўнага матэрыяла);
- *прадметныя сродкі навучання* (стэнды, плакаты, фатаграфіі, карціны, эскізы, схемы, графікі, геаграфічныя карты, дыяграмы, формулы, ураўненні, мадэлі, рэальныя прадметы, муляжы, макеты аб’ектаў, музычныя інструменты, пульты, падстаўкі, камертон, абсталяванне вучэбных аўдыторый для заняткаў);
- *тэхнічныя сродкі навучання* (ТСН - аўдыавізуальныя, камп’ютары, кабінеты праграміраванага навучання, фонатэка, аўтаматызаваныя навучаючыя сістэмы, кіно- і тэлефільмы, дыяпазітывы, мультфільмы і інш.); падзяляюцца на інфармацыйныя, кантралюючыя, навучаючыя;
- *творы мастацтва* - першасны сродак успрымання вучэбнага матэрыялу, крыніца інфармацыі і цэласнага ўспрымання мастацкага вобраза;
- *словы выкладчыка*.
-

**3.**_Формы арганізацыі педагагічнай дзейнасці_ – арганізацыйна аформленая ўзгодненая дзейнасць выкладчыка і вучняў, якая здзяйсняецца ў пэўным парадку і рэжыме. Сістэмы арганізацыі навучання:

- класна-урочная сістэма – асноўная форма навучання;
- дапаможныя формы навучання:
  а) пазаўрочныя (пазааўдыторныя, пазакласныя);
  б) пазашкольныя (дамашнія, самастойныя) формы.

Віды пазаўрочных і пазашкольных заняткаў: дамашняя самастойная работа навучэнцаў, прадметныя гурткі, вучэбныя экскурсіі, кансультацыі, факультатывы, курсы па выбары, практыкумы, лабараторныя і практычныя заняткі, семінары, інструктажы, дадатковыя заняткі, вучэбныя канферэнцыі, заняткі ва ўстановах сацыякультурнай сферы, клубная работа, паходы і спаборніцтвы.

Класіфікацыя арганізацыйных форм навучання: *па колькасці навучэнцаў:* франтальныя (масавыя, калектыўныя), групавыя (дробнагрупавыя), індывідуальныя; *па месцы навучання:* школьныя, пазашкольныя; *па працягласці заняткаў:* класічны ўрок, здвоены ўрок, урокі адвольнай працягласці.

Асноўныя віды ўрокаў: урокі вывучэння новых ведаў, урокі замацавання ведаў, урокі абагульнення і сістэматызацыі вывучанага, урокі фарміравання і замацавання новых уменняў і навыкаў, урокі праверкі (кантроля і карэкцыі, ацэнкі) ведаў і уменняў, урокі практычнага выкарыстання ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама уводны ўрок, выніковы ўрок, абагульняючы ўрок, кантрольны ўрок.

Асноўныя тыпы ўрокаў: камбініраваныя ўрокі, монаўрокі, нестандартныя ўрокі. Нестандартныя ўрокі: тэатралізаваныя ўрокі, урокі творчасці, урокі-творчыя справаздачы, урокі-конкурсы, урокі-гульні, урокі-канцэрты, урокі-экскурсіі, урокі-кансультацыі, урокі-залікі, урокі-семінары, міжпрадметныя ўрокі і інш.

На занятках мастацва вызначаюцца асноўныя этапы вывучэння мастацкага твора: 1) знаёмства з творам, яго эмацыянальна-вобразнае ўспрыманне; 2) аналіз мастацкага твора, яго драматургіі, зместу, сродкаў мастацкай выразнасці, яго асваенне ў разнастайных відах мастацкай вучэбнай дзейнасці (прагляд, слуханне, тэарэтычны аналіз, рухі пад музыку, імправізацыя, спевы і інш.), фарміраванне і развіццё на гэтай аснове мастацкіх здольнасцей і выканальніцкіх навыкаў; 3) цэласнае ўспрыманне твора, спасціжэнне яго маральнай сутнасці і мастацкай вобразнасці, канцэртнае выкананне твора.

План урока павінен уключаць: пералік яго асноўных этапаў, апісанне тэматыкі апытання, апісанне мастацкіх праблем для гутаркі, апісанне тэм для паўтору і замацавання пройдзенага, пералік задач і практыкаванняў, змест дамашняга задання, асноўныя тэзісы новага матэрыяла. План-канспект урока раскрывае яго ход з фармуліроўкай не толькі пытанняў да вучняў, але і мяркуемых адказаў, апісанне наглядных дапаможнікаў, поўнае вылажэнне тлумачэнняў выкладчыка. Гэта сцэнарый урока. План урока ўключае: агульныя звесткі пра ўрок (дата правядзення, прадмет, тэма ўрока, тып і від урока, клас ці вучань); мастацка-педагагічная ідэя ўрока (мэта урока - звышзадача, дыдактычныя, выхаваўчыя, развіваючыя, творчыя задачы ўрока); мастацка-педагагічны матэрыял (інструктыўны, мастацкі) – адбіраецца з улікам прынцыпа цэласнасці ўрока; структуру ўрока, паслядоўнасць яго этапаў (лагічная паслядоўнасць розных відаў дзейнасці на ўроку, якая будуецца з улікам прынцыпа кантраста); размеркаванне часу паміж рознымі этапамі ўрока з улікам недапушчэння стамлення вучняў; вучэбнае абсталяванне ўрока, сродкі навучання, ход урока: задачы і змест вучэбнага матэрыяла на кожным этапе ўрока; метады і прыёмы работы педагога, якія адпавядаюць мэце, задачам, вучэбнаму матэрыялу; спрагназаваныя магчымыя адказы і дзеянні вучняў у праблемных сітуацыях і адпаведная методыка работы; дамашняе заданне.

Формы мастацкага навучання ў навучальных установах прафесійнай мастацкай адукацыі: індывідуальныя, дробнагрупавыя, групавыя, калектыўныя заняткі, кансультацыі, рэпетыцыі, тэхнічныя залікі і акадэмічныя канцэрты, экзамены, паказы, адкрытыя ўрокі, майстар-класы, выканальніцкая,

педагагічная практыкі, лекцыі, семінары, практычныя заняткі, курсавая і дыпломная работы, рэфераты, самастойная работа.

Формы пазакласнай і пазашкольнай работы ў ДШМ: канцэрты-сустрэчы са знакамітымі харэографамі, выпускнікамі, вучнямі іншых ДШМ; канцэрты вучняў ДШМ (магчыма сумесна з выкладчыкамі) для розных аўдыторый; удзел вучняў ДШМ у мастацкай самадзейнасці агульнаадукацыйных школ, стварэнне аб'яднаных мастацкіх калектываў сацыяльна-культурных комплексаў "ДМШ-СШ-Клуб"; экскурсіі, наведванне канцэртаў, выстаў, музееў, тэатраў і г.д.

## Тэма (лекцыя) 8. Тэарэтычныя асновы мастацкага (харэаграфічнага) развіцця

Пытанні:

1. Паняцці і структура мастацкага развіцця.
2. Праблема даследавання мастацкіх здольнасцей у айчынных і замежных навуковых даследаваннях.
3. Узаемадзеянне сацыяльных і біялагічных фактараў у развіцці мастацкіх здольнасцей.
4. Дыягностыка мастацкіх здольнасцей.

**1.** *Мастацкае развіццё* – пераход у новы якасны стан мастацкіх здольнасцей, асабістых якасцей пазнавальных працэсаў у чалавеке пад уздзеяннем мастацтва. Развіццё чалавека праяўляецца ў развіцці яго здольнасцей, а не ў назапашванні вопыту, авалоданні ведамі, уменнямі і навыкамі (С.Л.Рубінштэйн). Іерархічная структура асноўных паняццяў мастацкага развіцця: Задаткі – Схільнасці - Здольнасці - Адоранасць (Музыкальнасць) - Талент (Геніяльнасць).

*Задаткі* – прыроджаныя анатама-фізіялагічныя асаблівасці нярвовай сістэмы і мозга, якія складаюць прыродную аснову развіцця здольнасцей. На аснове адных і тых жа задаткаў могуць развівацца розныя мастацкія здольнасці ў залежнасці ад спецыфікі віда дзейнасці. Прыроджанымі могуць быць толькі задаткі, якія складаюць аснову здольнасцей. У задатках заўсёды спалучаюцца фактары: а) спадчынныя – генетычна абумоўленыя; б) прыроджаныя – звязаныя з умовамі ўнутрывантробнага развіцця; в) узроставыя – псіхалагічныя асаблівасці, уласцівыя кожнай узроставай ступені развіцця; г) сацыяльна-культурныя. Усе фактары цесна звязаны паміж сабой.

У развіцці задаткаў узаемадзейнічаюць працэсы: а) біялагічнага выспявання; б) уздзеяння асяроддзя (выхавання і навучання); в) асаблівасці работы органаў пачуццяў і руху пры выкананні дзейнасці.

Шляхі праяўлення задаткаў ў розных людзей: 1) магчыма выбухная рэалізацыя задатка (на працягу некалькіх дзён) 2) пастаяннае паступовае выяўленне задатка і фарміраванн на яго аснове пэўнай здольнасці.

*Схільнасць* – выражэнне, праяўленне задатка і прыкмета здольнасці, якая фарміруецца. Схільнасць - асобасная прадумова здольнасцей, якая адлюстроўвае інтарэсы і імкненні чалавека, падахвочвае яго да дзейнасці, у якой могуць развівацца здольнасці. Схільнасці і здольнасці звязаны паміж сабой, пры гэтым на розных узроставых этапах можа дамініраваць нешта адно.

*Мастацкія здольнасці* – індывідуальна-псіхалаічныя асаблівасці чалавека, якія дапамагаюць яму паспяхова набываць веды, навыкі і выкарыстоўваць іх у практычнай прадуктыўнай мастацкай дзейнасці. Структура мастацкіх здольнасцей:
1.Агульныя (мастацка-эстэтычная)
2. Псіхаматорныя (тэхнічныя)

*Мастацка-эстэтычныя (агульныя) здольнасці* – здольнасці, звязаныя з успрыманнем, асмысленнем, аднаўленнем, інтэрпрэтацыяй мастацкіх твораў, эмацыянальным пагружэннем ў мастацкае перажыванне; здольнасці, неабходныя чалавеку для фарміравання мастацкага вобраза ў любым відзе мастацкай дзейнасці. *Псіхаматорныя (тэхнічныя, прыватныя) здольнасці* – неабходныя для паспяховага выканання канкрэтных відаў мастацкай дзейнасці – выканальніцкай, кампазітарскай, дырыжорскай, даследчыцкай, педагагічнай, розных відаў выканальніцкай дзейнасці. Асноўныя характарыстыкі мастацкіх здольнасцей : фарміруюцца і развіваюцца ў дзейнасці; развіваюцца ў працэсе выхавання і навучання; з'яўляюцца вынікам развіцця; магчыма ізаляванае развіццё асобных здольнасцей у канкрэтных відах мастацкай дзейнасці; магчымасць кампенсацыі адных здольнасцей другімі; не зводзяцца да ведаў, уменняў і навыкаў, але тлумачаць лёгкасць і хуткасць іх набыцця; забяспечваюць паспяховасць пэўнага віда дзейнасці.

*Музыкальнасць* (шырокае значэнне) – якасць ўспрымання, перажывання ці выканання чалавекам музыкі для выражэння інтуітыўнай глыбіні і тонкасці эмацыянальнага перажывання яе сэнсу. Вузкае значэнне: комплекс індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей, неабходных для заняткаў музычнай дзейнасцю, у выканальніцкай інтэрпрэтацыі музычных твораў. Фарміруецца і развіваецца толькі ў канкрэтнай дзейнасці канкрэтнага чалавека, таму ў розных людзей яна розная. Прыкметы музыкальнасці: здольнасць эмацыянальна перажываць музыку і выражаць сябе пры яе дапамоге; ранняе праяўленне музычнага слыху; наяўнасць устойлівай патрэбнасці і выбіральнасці у музычных ўражаннях; музычная актыўнасць – імкненне спяваць, слухаць, сачыняць, танцаваць пад музыку; прыродная выразнасць выканання. Кожны нармальны чалавек мае пэўную музыкальнасць.

Музычныя здольнасці бываюць *спецыяльныя* (для канкрэтнай музычнай прафесіі – дырыжор, піяніст і інш.) і *агульныя* (неабходныя для музыкальнасці). Вядучыя кампаненты музычных здольнасцей: эмацыянальная чуласць, музычны слых (ладавышынны, меладычны, гарманічны, унутраны, абсалютны, адносны і г.д.); пачуццё рытму; музычная памяць (рухальная, эмацыянальная, слыхавая).

*Мастацкая адоранасць* – комплекс мастацкіх здольнасцей у сукупнасці з агульнымі здольнасцямі (творчае ўяўленне, увага, воля і інш.).

*Мастацкая таленавітасць* – гэта асаблівая адоранасць, адметныя і незвычайныя здольнасці да якой-небудзь творчасці, віда мастацтва.

*Геніяльнасць* – гэта найвышэйшы ўзровень унікальнай рэалізацыі творчых і інтэлектуальных магчымасцяў асобы, якія выяўляюцца ў мастацве, навуцы і інш.

Прыкметы геніяльнасці: нестандартнае мысленне, спантаннасць і арыгінальнасць паводзін, уяўленне і ўвага да дэталяў, перфекцыянізм і мэтанакіраванасць, ранні ўзрост праявы, высокая ступень адчувальнасці і ранімасці і інш.

**2.** Два вызначальных фактара ў фарміраванні мастацкіх здольнасцей: 1) спадчыннасць (біялагізатарскія тэорыі); 2) сацыяльнае асяроддзе (сацыялагізатарскія тэорыі): сям'я, адукацыйная ўстанова, кваліфікацыя выкладчыкаў, уплыў сродкаў масавай інфармацыі, узровень адукацыі і сацыяльны статус бацькоў, запатрабаванасць прафесіі ў грамадстве. Замежныя даследаванні (біялагізатарскія тэорыі) прадстаўленыя ў Платона ("Здольнасці з'яўляюцца прыроджанымі"), Ф. Гальтона ("Наследственность таланта. Его законы и последствия" (1869): канцэпцыя пра "геніяльнасць і талент, якія перадаюцца па спадчыннасці"; Дженнсена (70-я гг. ХХ ст.) ("развіцце здольнасцей магчыма да пэўнай мяжы, адпушчанай прыродай. Геніяльнасць жа - гэта падарунак лёса, які мае прыроджаны характар"); Г. Айзенаха "структура поспеху ў мастацтве складаецца з 80 % гегетычных фактараў і 20% сацыяльных ўмоў і сям'і"); Т.Эдісона ( "геній – гэта 99 % пота і 1% натхнення").

Айчынныя даследаванні (сацыялагізатарскія тэорыі) прадстаўленыя наступнымі іменамі: Б.М.Цяплоў, Я. Назайкінскі, Ул. Медушэўскі, Л.С.Выгоцкі, Н. Ветлугіна, Л.А.Барэнбойм і інш. Б.М.Цяплоў ("Псіхалогія музычных здольнасцей") адзначае: "развіцце музычных здольнасцей магчыма ў далучэнні да мастацтва з ранняга дзяцінства пры ўмове актыўнай дзейнасці і працы над сабой».

**3.** Эфектыўнасць ўздзеяння мастацтва на развіцце чалавека залежыць: ад мастацка-эстэтычнай каштоўнасці твораў мастацтва – іх змястоўнасці, жанравай і стылевай разнастайнасці, арыгінальнасці, інш.; ад псіхафізіялагічных (ці біялагічных) асаблівасцей чалавека; ад сацыяльных асаблівасцей чалавека; ад духоўнасці асобы.

У псіхалогіі і філасофіі прадстаўлены розныя *інтэрпрэтацыі суадносін сацыяльных і біялагічных фактараў у развіцці чалавека*:

1. *Пазітывізм* (Г.Спенсер, З.Фрэйд і інш.) - прыроджаныя якасці вызначаюць будучыню чалавека (генетыка).
2. *Сацыялагізм* (Ч. Кулі) – сацыяльныя ўмовы жыцця чалавека вызначаюць яго будучыню, на першы план выходзіць калектыў, якому асоба падпарадкоўваецца.
3. *Марксізм* (К. Маркс) - сацыяльны і біялагічны фактары ў развіцці чалавека разглядаюцца як дыялектычныя суадносіны вышэйшага і ніжэйшага ўзроўняў развіцця матэрыі ў дачыненні да ўжо сфарміраванай асобы.

**4.** *Дыягностыка мастацкіх (харэаграфічных) здольнасцей* – выяўленне ўзрозня развіцця здольнасцей. Мэты дыягностыкі – здзяйсненне прафесійнага адбора; выяўленне ступені вызначанасці мастацкіх здольнасцей; падбор адпаведных методык развіцця; здзяйсненне кантроля за дынамікай развіцця здольнасцей.

*Прынцыпы* правядзення дыягнастычных заданняў: А) стварэнне спакойных дабразычлівых умоў; Б) падбор заданняў ад простага да складанага з улікам індывідуальнасці і ўзросту; В) недавер вынікам дыягностыкі на 100 %.

Віды дыягнастычных заданняў: 1) тэсціраванне і 2) індывідуальная форма. Крытэрыі дыягностыкі вызначае сам педагог. Вынік – вызначэнне агульнага ўзроўню – нізкі, сярэдні, высокі і г.д. Напрыклад, крытэрыі дыягностыкі для харэаграфічнай спецыяльнасці: музычна-рытмічныя навыкі (узгодненасць рухаў з музыкай – яе характарам, тэмпам, дынамікай, формай); 2) знешні выгляд і сцэнічныя здольнасці (рост, прапорцыі цела, асанка і інш.); 3) спецыфічныя здольнасці (вываратнасць, стапа, балетны крок і г.д.).

## РАЗДЗЕЛ 3. АНТАГЕНЕЗ ХАРЭАГРАФІЧНАЙ І МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

### Тэмы (лекцыі) 9-10. Прадмет і перыядызацыі гісторыі мастацкай адукацыі. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы і сярэдневякоўе да XIV стагоддзя

Пытанні:
1. Прадмет і перыядызацыі гісторыі мастацкай адукацыі.
2. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы і перыяд Антычнасці.
3.Фарміраванне мастацкай адукацыі ў сярэдневяковай Еўропе, на беларускіх і рускіх землях да XIV стагоддзя.

**1.** *Гісторыя мастацкай адукацыі* вывучае вопыт развіцця тэорыі, методыкі і практыкі агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі ў канкрэтна-гістарычны перыяд; залежнасць мастацкай адукацыі ад пануючых філасофскіх поглядаў на ролю, месца чалавека і мастацтва ў грамадстве; магчымасці мастацтва ў выхаванні асобы ва ўмовах пэўнага грамадскага ўкладу жыцця той ці іншай краіны.

Асноўныя кірункі мастацкай адукацыі: народная, рэлігійная, свецкая. Асноўныя ўзроўні здзяйснення мастацка-адукацыйнага працэсу: агульная мастацкая адукацыя і прафесійная мастацкая адукацыя. Метадалагічныя падставы для перыядызацыі гісторыі мастацкай адукацыі: крыніцы педагогікі мастацкай адукацыі; развіццё мастацтва ў канкрэтна-гістарычны перыяд; адзінства асноўных кірункаў мастацтва і мастацкай адукацыі; узаемасувязь агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі.

*Перыядызацыя мастацкай адукацыі ў Еўропе*:
1. Старажытныя часы
2. Ранняе і сярэдняе сярэдневякоўе (V-XIII стст.)
3. Эпоха Адраджэння (XIV-XVI стст.)
4. Эпоха Асветы (XVII-XVIII стст.)
5. XIX-пачатак XX стст.
6. XX ст.
7. Канец XX - пачатак XXI стст.

*Перыядызацыя мастацкай адукацыі ў Беларусі*:
1. Эпоха ранняга сярэдневякоўя (V-X стст.)
2. XI-сярэдзіна XIII стст.
3. Сярэдзіна XIII-канец XVIII стст.
4. XIX - пачатак XX стст.
5. XX ст. (1917-1991 гг.)
6. 1991 г. - да нашага часу.

**2.** У першабытныя часы закладваюцца асновы мастацтва, якое было цесна ўплецена ў рэальны працэс жыцця; містычна-магічнае разуменне ўздзеяння мастацтва на рэчаіснасць. Сінкрэтычны характар мастацкай дзейнасці – абрады, музыка, танец, пантаміма і іншыя праяўленні мастацкай творчасці існавалі ў непарыўным адзінстве з рэальным жыццем.

У перыяд Антычнасці IV-III тыс. да н.э. (Грэцыя, Рым, Кітай, Індыя, Вавілон, Урарту, Егіпет, Сірыя) адбываеца фарміраванне і развіцце мастацтва пад уплывам прыродазнаўчых навук, філасофіі, эстэтыкі даследаванні ў розных галінах мастацтва – тэорыі музыкі, акустыкі, гармоніі і інш. Назіраецца падабенства поглядаў у культуры краін Еўропы і Усходу. Народнае мастацтва з’яўляецца важнейшай крыніцай станаўлення не толькі відаў мастацтва, але і мастацкай народнай і свецкай педагогікі.

Прафесіяналізацыя мастацкай дзейнасці ў грамадстве вядзе да стварэння першых школ прафесійнай мастацкай адукацыі. Прызнанне важнасці мастацтва ў маральным выхаванні чалавека адлюстравалася ў абавязковым вывучэнні мастацтва ў старажытнай агульнаадукацыйнай школе. Мастацкая адукацыя (як і агульная) мела класавы характар у межах старажытнага класавага грамадства.

**3.** У перыяд ранняга сярэднявякоўя (V-VIII ст.) мастацтва і адукацыя падпарадкоўваюцца вырашэнню рэлігійна-дыдактычных задач, што звязана з распаўсюджаннем хрысціянства (у Еўропе і Русі) – афіцыйна прызнанай рэлігіяй мастацтва.

У сярэдняе сярэднявякоўе (IX-XIII ст.) фарміруюцца першапачатковыя формы рэлігійнай мастацкай адукацыі. У грамадстве дамінуе мастацкая адукацыя рэлігійнай накіраванасці. Свецкая мастацкая адукацыя існуе ў межах мастацкай культуры скамарохаў, рыцарскай культуры, гарадской культуры заможных і бедных гараджан. Нараджаецца універсітэцкая форма свецкай еўрапейскай адукацыі з вывучэннем філасофіі, музыкі і іншых дысцыплін. У эпоху Адраджэння Беларусь была часткай Вялікага княства Літоўскага і яе культурнае і эканамічнае развіццё было цесна звязана з Заходняй Еўропай. Сярод найбольш важных тэндэнцый у мастацкай адукацыі адрозніваюцца наступныя. Па-першае, можна было атрымаць мастацкую адукацыю ў школах манастыроў, а па-другое, таксама ў дамах буйных феадалаў. Потым можна было працягнуць навучанне ва ўніверсітэтах Еўропы, напрыклад, Кракоўскім, дзе вучыліся вядомыя культурныя дзеячы - беларусы С. Будны і Ф. Скарына. У 1579 г. у Вялікім княстве Літоўскім была адкрыта першая вышэйшая навучальная ўстанова на ўсходзе Еўропы – Віленская Акадэмія. У 1632 г.- другая - Магілянская акадэмія ў Кіеве.

***Тэмы (лекцыі) 11-12. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпохі Адраджэння і Асветы***

Пытанні:

1. Зараджэнне мастацкай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV – XVI ст.).

2.Мастацкая адукцыя ў эпоху Асветы (XVII – XVIII ст.) у Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях

**1.**У эпоху Адраджэння адбываецца зараджэнне балетнага мастацтва, музычнай і харэаграфічнай адукацыі, дынамічнае развіцце свецкага мастацтва і адпаведнай яму свецкай адукацыі. Вылучаюцца прафесіі кампазітара, музыканта-выканаўцы, танцоўшчыка, выкладчыка музыкі і танца. Фарміруецца сістэма ўстаноў прафесійнай музычнай адукацыі пераважна на базе храмавых харавых школ і сіроцкіх прытулкаў (кансерваторый). Дынамічна развіваецца інфраструктура мастацкай адукацыі: філарманічныя, пеўчыя і іншыя таварыствы, кнігадрукаванне, майстэрні па вырабу музычных інструментаў і інш. Мастацтва (музычнае) вывучаецца ў агульнаадукацыйных навучальных установах – рэлігійных і свецкіх (музычныя школы пры пеўчых таварыствах і цэхавых брацтвах музыкантаў, школы пры дварах буйных феадалаў). Асновы мастацтва вывучаюцца ў асяродку бедных слаёў насельніцтва з дапамогай вандроўных “майстроў граматы”, у прытулках і сіроцкіх дамах, у сем’ях скамарохаў.

Узнікаюць публічны і прыдворны тэатры, у межах якіх забяспечваецца перадача мастацкага вопыту. Зараджаецца балетнае мастацтва, з’яўляюцца прафесіі танцоўшчыка, танцмайстра і выкладчыка танцаў, вылучаюцца сцэнічны, класічны і бальны танцы. Выдаюцца трактаты па методыцы выкладання музыкі і танца.

У XIV - XVI стст. на беларускіх землях існавала сістэма агульных навучальных устаноў розных веравызнанняў. Шматлікія праваслаўныя, каталіцкія, пратэстныя і езуіцкія школы ў цэрквах і манастырах, дзе яны выкладалі не толькі пісьменнасць, але і музычныя і спеўныя навыкі, асабліва шырока распаўсюджаны. Былі таксама прыватныя школы, школы ў княжацкіх дамах. Але найбольшая цікавасць у гэтым плане - брацкія школы - рэлігійныя нацыянальныя арганізацыі духоўных і свецкіх грамадзян, якія выступалі за адукацыю насельніцтва. У брацкіх школах дзеці атрымлівалі агульную адукацыю і мастацкую адукацыю. Яны вывучалі сем бясплатных навук, а таксама беларускі, польскі, лацінскі, грэчаскі і іншыя мовы, харавыя спевы. Школы існавалі ў Vilna (1584), Mogilev (1590), Brest (1591), Grodno, Minsk (1592), Orsha і г.д.

З канца XIV-XVI стст. у Беларусі ўзнікае новая форма тэатральнага жыцця і тэатральнай адукацыі - школьны тэатр, які заклаў аснову для фарміравання мастацкай адукацыі не толькі ў галіне тэатральнага, але і харэаграфічнага і музычнага мастацтва. У спектаклях школьнага тэатра вучні адточвалі акцёрскае майстэрства. Першы на тэрыторыі Беларусі школьны тэатр быў заснаваны ў Полацку ў 1585 г.

**2.**Мастацкая адукацыя ў эпоху Асветы (XVII-XVIII стст.) характарызуецца зараджэннем педагогікі як навукі аб адукацыі чалавека, распрацоўваюцца агульнапедагагічныя заканамернасці і прынцыпы выхавання і навучання (Ян Амас Коменскі, І. Г. Песталоцці, Ф. Бэкон, І. Гербард, Ф. Скарына). Распаўсюджваюцца ідэі асветніцтва, агульнадаступнасці адукацыі, у тым ліку і мастацкай: ствараюцца спрошчаныя сістэмы музычнага навучання, у змест вучэбных прадметаў уключаецца народная песня, навучанне прадугледжвае ігру на музычных інструментах. Адбываецца размежаванне сістэм прафесійнай і агульнай мастацкай адукацыі, умацоўваецца вучэбна-метадычная база мастацкага навучання, у тэарэтычных трактатах развіваецца тэорыя харэаграфічнага (балетнага) мастацтва: сістэма запісу танца, правілы выкладання мастацтва танца і інш. Ствараюцца комплексныя навучальныя ўстановы мастацкай адукацыі – музычна-драматычныя (тэатральна-музычныя і інш.) школы і інстытуты, а таксама спецыялізаваныя балетныя школы (школы танца); мастацкая адукацыя становіцца важным элементам дамашняй адукацыі магнатаў; выкладанне танца ўводзіцца ў праграмы агульнаадукацыйных і спецыялізаваных (ваенных) навучальных установ для магнатаў.

На беларускіх і расійскіх землях фарміруецца сістэма прафесійнай і агульнай музычнай і харэаграфічнай адукацыі: ствараюцца балетныя, музычна-тэатральныя школы, танец выкладаецца ў дзяржаўных навучальных установах, уваходзіць у змест дамашняй адукацыі.

У XVII ст. вядомыя культурныя і адукацыйныя цэнтры на тэрыторыі Беларусі былі прадстаўленыя двума асноўнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі - Віленскай акадэміяй езуітаў і Кіеўска-Магілянскай акадэміяй, дзе выкладалі шмат вядомых педагогаз у сферы культуры, літаратуры і мастацтва, напрыклад, С. Полоцкі, М. Сербеўскі.

### *Тэмы (лекцыі) 13-14. Харэаграфічная і музычная адукацыя ў XIX – пачатку XX ст. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XX ст.*

<u>Пытанні:</u>

1. Харэаграфічная і музычная адукацыя ў Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях ў XIX –пачатку XX ст.
2. Станаўленне і развіццё савецкай харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XX ст.
3. Замежныя сістэмы харэаграфічнай і музычнай адукацыі XX ст.

**1.**Мастацкая адукацыя ў XIX-пачатку XX стст. У Еўропе ствараецца сучасная шматузроўневая сістэма свецкай прафесійнай мастацкай адукацыі, прадстаўленая разнастайнымі навучальнымі ўстановамі. Вылучаюцца прафесіі

выкладчыкаў музыкі і танцаў, забяспечваецца іх падрыхтоўка для сістэм прафесійнай і агульнай мастацкай адукацыі.

Распаўсюджваецца ідэя ўсеагульнасці мастацкай адукацыі, ствараецца сістэма агульнай мастацкай адукацыі, забяспечваецца даступнасць пачатковай мастацкай адукацыі, пашыраецца дзейнасць культурна-асветніцкіх арганізацый, развіваецца аматарская народная творчасць, адбываецца станаўленне педагогікі сцэнічнага народнага танца.

Балетная адукацыя ў Расіі займае вядучыя пазіцыі ў свеце; у падрыхтоўцы артыстаў балета ўзаемадзейнічаюць французская і італьянская школы танца, нараджаецца руская школа класічнага танца, характарнага танца; удасканальваецца вучэбны працэс на балетных аддзяленнях тэатральных вучылішчаў Масквы і Пецярбурга.

У Еўропе зараджаецца педагогіка рытмапластычнага танца, мадэрн-танца, экспрэсіўнага танца.

У пач. XIX ст. на сцэнах прыватных антрэпрыз, якія вызначылі з’яўленне гарадскіх тэатраў, праходзілі выступленні танцавальных труп, аматарскіх калектываў і гастраліруючых прафесійных балетных ансамблей (Ніжынскага, Чысцякова, Пеціпа). Адкрыцце гарадскіх тэатраў у Віцебку пад кіраўніцтвам Пеціпа (1845), у Мінску – тэатр Дуніна-Марцінкевіча, які аб’ядноўвае музычнае, танцавальнае і драматычны віды мастацтва, пастаноўка оперы “Сялянка” (1852).

Харэаграфія суправаджае шматлікія сферы жыцця і адукацыі: балі, вечарынкі, маскарады, сямейныя танцавальныя вечары. Дзеці дваран навучаліся дома ў прыватных настаўнікаў танцаў, у пансіёнах, школах і секцыях пластыкі, дзе выкладалі баліьны, пабытовыя танцы (у Мінску С.Грачанін, М Лейкінд з 1896г., школа бальнага танца артыста балета Н. Саналоўскага.

У пач. XX ст. – стварэнне першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага на аматарскай глебе (1907 -1913), якая ставіла п’есы з уключэнем танцавальных, вакальных, харавых нумароў у суправаджэнні “траістай музыкі” і ажыццяўляла прафесіяналізацыю народных традыцый – перанясенне аутэнтычных танцаў на прафесійную сцэну. 1917 г. – Беларускае таварыства драмы і камедыі, 1916-1920 – мастацкае аб’яднанне “Беларуская хатка”, якое прапагандавала музычнае, харэаграфічнае, тэатральнае мастацтвы і ўбірала ў свой склад танцавальную трупу Ч. Радзевіча, драматычную Ф. Ждановіча, хор В. Тэраўскага, аркестр народных інструментаў Ф. Захара. У 1920 г. увайшло у склад Беларускага тэатра імя Я. Купалы. Праца М. Ельскага “Народныя танцы Мінскай губерніі”.

Навуальныя ўстановы у пач. XX ст.: гімназіі (Марыінская жаночая гімназія ў Мінску, жаночыі гімназіі А. Рэйман (з 1910), Аляксееўская (з 1914); пансіёны і інстытуты (пансіён Людвіга і Марыі Мантэграндзі, Дамініка Стэфановіча ў Мінску; інстытут шляхецкіх дзяўчат, дзе анрамя агульнаадукацыйных дысцыплін выкладалі мастацкія – музыку, спевы, малюнак, танцы і пластыку (у Аляксееўскай гімназіі). Выхаваўцы гімназій і

пансіёнаў выступалі з канцэртамі, ус пектаклях, музычна-літаратурных вечарах, давалі адкрытыя урокі музычна-рытмічнага выхавання па сістэме Жака Далькроза.

**2.** Мастацкая адукацыя ў СССР (1917-1991 гг.). Ствараецца дзяржаўная трохузроўневая сістэма прафесійнай мастацкай адукацыі (Ш В В), змест якой складае вывучэнне свецкай і народнай мастацкай культуры. Рэалізуюцца прынцыпы ўсеагульнасці агульнай мастацкай адукацыі, даступнасці (на конкурснай аснове) прафесійнай мастацкай адукацыі. Мастацкая адукацыя носіць свецкі характар, забяспечваецца цэнтралізаванае партыйна-камуністычнае кіраванне адукацыйнымі працэсамі ў краіне. У Беларусі фарміруюцца трохузроўневая сістэма прафесійнай музычнай і харэаграфічнай адукацыі, а таксама разгалінаваная сетка ўстаноў, якія забяспечваюць агульную музычную і харэаграфічную адукацыю асобы.

Мастацкая адукацыя ў Беларусі на мяжы XX-XXI стст. Ствараецца нацыянальная сістэма мастацкай адукацыі, якая цесна звязана з сістэмай агульнай адукацыі. Нацыянальная сістэма мастацкай адукацыі ўключае падсістэмы агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі. Падсістэмы агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі цесна звязаны паміж сабой, хаця і адрозніваюцца па сваіх мэтах. У падсістэме прафесійнай мастацкай адукацыі забяспечваюцца пераемнасць і непарыўнасць узроўняў і ступеняў адукацыі.

*У Расіі* станаўленне і развіцце харэаграфічнай адукацыі звязана з асобай *А. Ваганавай*, якая з 1921 г. выкладала ў Ленінградскім харэаграфічным вучылішчы, аўтара кнігі “Асновы класічнага танца”, дзе выкладаецца яе педагагічная сістэма.

З 1920 г. распаўсюджанне набывае сістэма музычна-рытмічнага выхавання *Э.Жака-Далькроза*, яго кніга “Рытм” выдадзена ў перакладзе на рускую мову (1922). Адкрываюцца ў Маскве і Петраградзе у 1920-я гг. спецыяльныя навучальныя ўстановы рытмічнага выхавання па яго сістэме, а таксама шмалікія іншыя *прыватныя* танцкласы, студыі, гурткі і *дзяржаўныя* установы – харэаграфічная студыя, балетная школа пры Марыінскім тэатры. Петраградскае тэатральнае вучылішча у 1928 г. было рэарганізавана ў харэаграфічны тэхнікум ( з 1937 г. – Ленінградскае харэаграфічнаае вучылішча, з 1991 г. – Акадэмія рускага балета іая В.Аганавай).

У *Маскве* з 1918 г. дзейнічаюць балетная студыя пры *Маскоўскім тэатральным вучылішчы* (кіраўнік К. Галязоўскі), школа “эксперыментальнага балета” Айседоры Дункан, балетная школа В. Масолавай, якая з 1920 г. перададзена Вялікаму тэатру (у школе выкладаў М. Тарасаў, аўтар навуковай методыкі выкладання класічнага танца). У 1931 г. яна рэарганізуецца ў *Дзяржаўны маскоўскі балетны тэхнікум* (з 1932 г . – харэаграфічны тэхнікум) – сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова, дзе распрацоўваюцца праграмы па спецдысцыплінам, вядзецца наввукова-даледчая праца ў галіне харэаграфічнай адукацыі – складаюцца методыкі

выкладанння, робяцца пастаноўкі і г.д., выдаюцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі (першы па класічнаму танцу – "Методыка класічнага трэнажу" М. Тарасаў і інш, 1940 г.). З 1960 г. перайменоўваецца ў *Маскоўскае акадэмічнае харэаграфічнае вучылішча*, якое становіцца метадычным цэнтрам краіны па загаду Мінкульта СССР. У 1987 г. на базе вучылішча адкрыўся Маскоўскі дзяржаўны харэаграфічны інстытут з вучылішчам у структуры, потым з 1993 г. – факультэт павышэння кваліфікацыі, з 1994 г. – асісентура-стажыроўка па класе "тэатральнае мастацтва – харэаграфія". У 1995 г. перайменована ў *Маскоўскую дзяржаўную акадэмію харэаграфіі* –вышэйшую ўстанову з кафедрамі класічнага танца, дуэтна-класічнага танца, народна-сцэнічнага і гісторыка-бытавога танца, харэаграфіі, музычнай адукацыі і г.д. З 2002 г. адкрываецца спецыяльнасць "педагогіка харэаграфіі, "тэорыя і методыка навучання і выхавання (у галіне харэаграфіі).

*Вышэйшая ступень* харэаграфічнай адукацыі ствараецца ў СССР ужо у 1930-я гг. пры Ленінградскім дзярж. харэаграфічным тэхнікуме па ініцыятыве Ф. Лапухова і А. Ваганавай, Ленінградскай кансерваторыі імя Рымскага-Корсакава (кафедра балетмастраў) і пры Маскоўскім дзярж. Інстытуце тэатральнага мастацтва імя Луначарскага (ГІТІС) – кафедра харэаграфіі пад кір. Р. Захарава.

Адкрываюцца *сярэднія* харэаграфічныя вучылішчы ў Кіеве (1935), Пярмі і Мінску (1945), Вільнюсе (1952); аддзяленні па падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх калектываў у культурна-асветнікіх вучылішчах, аддзяленні харэаграфіі у ДШМ; кафедры харэаграфіі у Інстытутах культуры. Такім чынам у СССР у 2 палове XX ст. створана 3-х узроўневая сісэма харэаграфічнай адукацыі: пачатковая ступень (ДШМ), сярэдняя спецыяльная (вучылішчы) і вышэйшая (ГІТІС, кансерваторыя, інстытуты культуры). Стваралася сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. У 1970-я гг. аформіўся змест харэаграфічнага навучання: у сярэдніх устновах, напрыклад, у Ленінградскім харэаграфічным вучылішчы – 8 гадоў на асноўным аддзяленні, 6 г. – на эксперыментальным, 5 г. – на народна-характарным, 2 г. – на педагагічным).

У пач. XXI ст. у Рассіі 8 дзярж. устаноў прафесійнай харэаграфічнай адукацыі (вядучыя – Пецярбургская (ваганаўская) акадэмія рускага балета (з 1991) і Маскоўская дзяржаўную акадэмію харэаграфіі (з 1995). У Расіі пабудавана эфектыўная і прызнаная ва ўсім свеце сістэма бесперапыннай прафесійнай адукацыі: *першы этап* – з 5-6 гадоў у дашкольным узросце па 4 клас з вывучэннем агульнаадукацыйных і спецдысцыплін; *другі этап* – харэагрфічныя вучылішчы з 2-хступенчатым навучаннем: 5-9 кл. і далей – сярэднеспецыяльная адукацыя з вучэбна-сцэнічнай практыкай; *трэці этап* – у вышэйшых установах.

Калектывы: 1937 г. – Ансамбль народнага танца СССР пад кір. І. Маісеева і Ансамбль нар. танца Украінскай СССР; 1938 г. – танцавальная група пры хоры імя Пятніцкага; 1948 г. – Акадэмічны ансамбль танца "Бярозка".

*У Беларусі* ў 1920 г. адкрыцце пры БДТ балетнай студыі пад кір. К Алексютовіча, дзе рыхтавалі пастаноўкі балетаў, выконваліся факстроты, танга, выступалі гастралеры (Айседора Дункан).

Установы адукацыі: 1924 г. – пры Мінскім музычным тэхнікуме адкрыліся харэаграфічны і оперны класы.

Пры БДТ – студыя оперы і балета, на базе якой ў 1933 г. адкрыты БДТ оперы і балета.

1932 г. – на базе Белдзяржкансерваторыі – на вакальным аддзяленні выкладаліся сцэнрухі і рытміка (Д. Румянцаў).

1939 г. – адкрыцце тэатральнага вучылішча з харэаграфічным аддзяленнем (узначаліла З. Васільева, вучаніца Ваганавай).

1945 г. – Харэаграічнае вучылішча (пасля 3-га класа прымаюцца дзеці). З 1995 г. – гэта Белдзярж. харэаграфічны каледж.

З 1970-х гг. адкрыцце культурна-асветніцкіх вучылішчаў з харэаграфічнымі аддзяленнямі:

1928 г. – Магілеў, 1948 - Гродна (хар. аддз. у 1959), 1971 - Віцебск,, 1975 - Мінск.

1975 г. – Мінскі інстытут культуры (каф. харэаграфіі з 1977 г.)

У ДШМ адкрываюцца харэаграфічныя класы.

Стваюцца самадзейныя харэаграфічныя калектывы пры клубных і пазашкольных установах, прафесійныя: Ансамбль бел. песні і танца Дзяржфілармоніі БССР (1938), Бел. Ансамбль песні і танца пад кір. Р. Шырмы, узброеных сіл, пагранічнікаў і інш.

1952 г. – Дзярж. народны хор БССР пад кір. Г. Цітовіча, які ўключаў і танцавальну групу.

1959 г. – Дзярж. Ансамбль танца БССР (кір. А. Апанасенка, з 1086 г. – В. Дудкевіч).

1970 г. - Дзярж. тэатр муз. камедыі з балетнай трупай у складзе.

1974 г. – Беларускі фальклорна-этнаграфічны ансамбль “Харошкі” (маст. кір. В. Гаявая).

У сучаснай Беларусі паспяхова развіваюцца розныя накірункі харэарафічнай дзейнасці і адукацыі:

- падрыхтоўка па бальна-спартыўным танцам у больш чым 60 клубах (палова з іх у Мінску);
- з 1990-х гг. адкрыцце новых навуальных устаноў: Пінскае вучылішча мастацтваў з харэаграфічным аддзяленнем; кафедра харэаграфіі ў БДА музыкі з 1994 г.
- перайменаванне вучылішчаў ў каледжы, вышэйшых – ва унверсітэт (БДУКМ, 2004), Акадэмія музыкі.

**3.***Замежныя сістэмы музычна-рытмічнага выхавання і харэаграфічнай адукацыі:*

- Сістэма Э.Жака-Далькроза
- Сістэма К.Орфа
- Сістэма Дз.Кабалеўскага
- Дзяржаўная і прыватная мастацкая адукацыя ў замежных краінах
- Міжнародныя недзяржаўныя арганізацыі па мастацкай адукацыі.

Найбольшую вядомасць у еўрапейскіх краінах атрымалі сістэмы Музычна-рытмічнага выхавання венгерскага кампазітара Золтана Кодая і аўстрыйскага педагога-музыканта Карла Орфа. Абедзве гэтыя сістэмы маюць шэраг агульных характарыстык: апора на народную музыку, выхаванне музычнай культуры і развіццё музычна-творчых здольнасцяў дзяцей як мэта музычнага выхавання. Сярод найбольш важнага музычна-педагагічнай спадчыны Карла Орфа варта адзначыць апублікаванае ў 1931 годзе дапаможнік па музычнаму выхаванню пад назвай «Шульверк» (« Музыка для дзяцей »), які ўяўляе сабой пяцітомнае сход п'ес для харавога выканання ў суправаджэнні інструментаў, рытмічных і декламационных практыкаванняў, тэатралізаваных сцэнак з каментарыямі і тэкстамі песень, прыказак, загадак, цвялілак.

Цікавасць уяўляюць і прынцыпы музычнага выхавання К. Орфа:
– шырокае выкарыстанне музычнага фальклору;
– развіццё творчага ўяўлення і фантазіі вучняў у працэсе імправізацыі, індывідуальнага і калектыўнага музіцыравання;
– сувязь музыкі з жэстам, словам, танцам, пантамімай.
Змест пачатковага музычна-рытмічнага выхавання па К. Орфу ўключае наступнае:
– калектыўнае элементарнае музіцыраванне дашкольнікаў як фактар выхавання музычнага густу і стварэнне разам з музыказнаўцам К. Заксам дзіцячага інструментара;
– выкарыстанне рытміка-маўленчых і маўленчых поліфанічных практыкаванняў;
– развіццё гукавысотнага слыху і пеўчых навыкаў дзяцей;
– прымяненне адноснай ( рэлятыўнай ) сістэмы сольфеджирования разам з абсалютнымі назвамі гукаў;
– стымуляванне самастойнасці і творчага пошуку навучэнцаў шляхам навадных пытанняў, заўваг, абмеркавання варыянтаў заданняў;
– прымяненне музычна-рытмічных рухаў, рытмічных і рухальных імправізацый.

Музычна-педагагічная дзейнасць З. Кодая была накіравана на стварэнне венгерскай сістэмы музычнага выхавання дзяцей. У сувязі з гэтым ён выдаў шэраг навучальных дапаможнікаў для дзяцей, сярод якіх можна адзначыць «Зборнік песень для школ», апублікаваны ў 1943 годзе, «333 практыкаванні ў чытанні з ліста ». Цікава, што прынцыпы музычнага выхавання З. Кодая ўключаюць наступнае: ўсеагульная музычная пісьменнасць, стварэнне агульнаадукацыйных школ з музычным ухілам, пераважнае выкарыстанне

венгерскага народна-песеннага музычнага матэрыялу, навучанне харавому спеву па нотах, развіццё ўнутранага слыху.

Сярод метадаў музычнага выхавання З. Кодая варта адзначыць наступныя: рэлятыўная сольмизация і абсалютная сістэма натацыі, ручныя знакі, харавое спевы acappella, развіццё рытмічнага слыху шляхам выкрочвання, плясканне ў далоні, отстукивания рытму, гульнявая дзейнасць, рытмічныя і меладычныя імправізацыі.

Да формаў музычнага выхавання, прапанаваным З. Кодаем ставяцца штодзённыя музычныя заняткі, харавыя і аркестравыя рэпетыцыі, пазакласная і кружковая праца.

*Характэрныя рысы мастацкай адукацыі* ў розныя гістарычныя перыяды:

1. Мастацкая адукацыя ў кожны гістарычны перыяд выступае ў адзінстве трох асноўных кірункаў мастацтва і двух узроўняў здзяйснення мастацка-адукацыйнага працэсу.
2. Арганізацыя мастацкай адукацыі ў грамадстве ў канкрэтна-гістарычны перыяд адпавядае ўзроўню развіцця пэўнага віду мастацтва.
3. Працэс станаўлення і развіцця мастацкай адукацыі мае свае асаблівасці ў кожным з кірункаў і ў кожнай з краін.
4. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі на беларускіх землях здзяйсняліся ў кантэксце еўрапейскага гісторыка-педагагічнага працэсу.

## Раздзел 4. МАСТАЦКА-ПЕДАГАГІЧНАЕ МАЙСТЭРСТВА

### Тэма (лекцыя) 15. Паняцце, структура і змест мастацка-педагагічнага майстэрства.

Пытанні:

1. Мастацка-педагагічнае майстэрства: паняцце і структура.
2. Змест мастацка-педагагічнага майстэрства.
3. Спецыфіка дзейнасці педагога мастацтва.

**1.***Мастацка-педагагічнае майстэрства* – гэта прафесійнае ўменне аптымізаваць ўсе віды мастацка-выхаваўчай і вучэбнай дзейнасці, накіраваць іх на ўсебаковае развіцце і ўдасканаленне асобы, фарміраванне яго здольнасцей. Сутнасць педагагічнага майстэрства ў асобе выкладчыка: яго пазіцыі, здольнасці кіраваць дзейнасцю на высокім мастацкім ўзроўні.

Аўтары падыходаў да вызначэння структуры прафесійна-педагагічнага майстэрства Бакланава Н.К., Азараў ЮП., Зязюн І.А., Хазяінаў Г.І., Кухарава М.В. і Рашацько В.С., Піонава Р.С. называюць наступныя асноўныя кампаненты структуры мастацка-педагагічнага майстэрства. Структуру мастацка-педагагічнага майстэрства складае комплекс якасцей асобы выкладчыка – гуманістычная накіраванасць дзейнасці, прафесійныя веды і ўменні педагога, індывідуальна значныя якасці і знешняя культура, педагагічныя здольнасці, каштоўнасці і педагагічная тэхніка.

*Гуманістычная накіраванасць дзейнасці* – сверхзадача выкладчыка, яго адказнасць перад будучыняй за веды, навыкі пры спалучэнні з вялікай любоўю да вучняў.Л. М. Талстой: "Если учитель соединяет в себе любовь к делу и ученикам, он – совершенный учитель". Гуманістычная накіраванасць асобы педагога харэаграфіі мяркуе выхаваўчае ўздзеянне інтарэсаў, каштоўнасных арыентацый, ідэалаў, пераваг самага педагога на асобу вучня у працэсе харэаграфічнага навучання. Каштоўнасныя арыентацыі педагога могуць быць накіраваны:

а ) на сябе ў выглядзе самасцвярджэння ў вачах калегаў па працы, вучняў і іх бацькоў;

б ) на педагагічны працэс, калі педагог пастаянна ўдасканальвае сродкі, метады і змест адукацыі;

у ) на вучня, калі мэтай дзейнасці педагога становіцца асобасны рост кожнага вучня па індывідуальнай траекторыі руху.

Апошняя накіраванасць ўяўляе сабой гуманістычную стратэгію педагога-музыканта, якая прадугледжвае творчае пераўтварэнне сродкаў, тэхналогій і аб'екта выхавання. Вельмі важна для педагога-музыканта гарманічна скарэктаваць ўсе віды накіраванасці пры вядучай накіраванасці на гуманізацыю дзейнасці.

*Прафесійныя веды і ўменні* – комплекс метадычных, метадалагічных, тэхналагічных і тэарэтычных ведаў педагога (веданне прадмета, методыкі выкладання, педагогікі, псіхалогіі), псіхолага-педагагічныя ўменні (гнастычныя, канструкцыйныя, камунікатыўныя, арганізатарскія, спецыяльныя).

*Індывідуальна значныя якасці і знешняя культура педагога* – асобасна-этычныя якасці (адносіны педагога да справы, грамадства, іншых людзей, самога сябе, прафесійна-этычныя якасці).

*Педагагічныя здольнасці* – камунікатыўнасць, прафесійная зоркасць і інтуіцыя, дынамізм асобы (здольнасці да валявых рашэнняў), эмацыянальная ўстойлівасць, аптымістычнае прагназіраванне, крэатыўнасць. Педагагічныя здольнасці педагога-музыканта можна ўмоўна падзяліць на дзве групы: общепедагогические і спецыяльныя. Вядучымі ў педагагічнай дзейнасці з'яўляюцца: камунікатыўнасць, перцэптыўныя здольнасці, дынамізм асобы, эмацыйная ўстойлівасць, аптымістычнае прагназаванне, крэатыўнасць, арганізатарскія, даследчыя, канструктарскія і інш. Спецыяльныя здольнасці ўключаюць: высокаразвітыя музычны і рытмічны слых, памяць, пачуццё музычнага рытму, а таксама высокі ўзровень выканальніцкай і метадычнай падрыхтоўкі.

Таксама да пералічаных дадаюцца такія кампаненты, як: вопыт прафесійна-педагагічнай творчай дзейнасці, паспяховасць навучання (выніковы паказчык – глыбіня ведаў навучэнцай, іх удзел ў алімпіядах, конкурсах), псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць (псіхолага-педагагічныя веды, уменні і навыкі і асобасныя якасці педагога-майстра).

**2.**Майстэрства – найвышэйшы ўзровень мастацка-педагагічнай культуры спецыяліста, якасная характарыстыка яго мастацка-педагагічнай адукаванасці. *Змест мастацка-педагагічнага майстэрства*, такім чынам, складаюць такія кампаненты мастацкай адукаванасці, як навучанасць, выхаванасць і развітасць.

*Мастацка-педагагічная навучанасць* як сукупнасць мастацка-педагагічных ведаў, уменняў і навыкаў, часта называецца прафесіяналізмам. Яна ўбірае ў сябе:

а) прадметную кампетэнтнасць (веданне свайго прадмета, гісторыі і тэорыі мастацтва, яго асноўных катэгорый і заканамернасцей развіцця, развітыя ўменні і навыкі (выканальніцкія, спецыяльныя);

б) метадычную кампетэнтнасць (веданне методыкі выкладання, тэарэтычных асноў мастацкага навучання, выхавання і развіцця асобы, методыкі навыковага даследавання праблем мастацтва, арганізацыі мастацка-педагагічнага працэсу, работы з навукова-метадычнай літаратурай).

*Мастацка-педагагічная выхаванасць* педагога-майстра – гэта адзінства яго прафесійна-педагагічнай свядомасці і ўнутранай актыўнасці. Асноўныя паказнікі станаўлення прафесійнай самасвядомасці спецыяліста – фарміраваннне ўменняў самааналізу, саманазірання, самаўспрымання,

самаацэнкі, самакантролю і самарэгуляцыі ў прафесійнай дзейнасці. Мастацкая выхаванасць педагога характарызуецца шэрагам асобасна-этычных якасцей, якія праяўляюцца ў адказнасці да справы, добрасумленнасці ў рабоце, працавітасці, дысцыплінаванасці, самастойнасці, павагe да калег, аб'ектыўнасці ў іх ацэнке.

*Мастацка-педагагічная развітасць* асобы разглядаецца ў адзінстве яе агульнага і прафесійнага развіцця: агульных функцыянальных механізмаў псіхікі, агульных здольнасцей асобы, творчага прафесійнага мыслення, мастацкіх і педагагічных здольнасцей, характару.

**3.***Спецыфіка дзейнасці педагога мастацтва* блізкая да майстэрства акцера: у ей спалучаюцца талент і майстэрства. Гэта "тэатр аднаго акцера", які будуецца па прынцыпах тэатральнага дзейства, таму педагогу важна ведаць прынцыпы і законы тэатральнага дзеянні, прадстауленыя у сістэме К.С. Станіслаўскага. Каштоўнасць яе для педагога заключаецца ў тым, што тут упершыню вырашаецца пытанне свядомага авалодання падсвядомым працэсам творчасці і праявы таленту асобы ў дзейнасці. Авалодаць гэтай сістэмай – значыць ўзбагаціць сябе спосабам павышэння каэфіцыента карыснага дзеяння ў любой творчай дзейнасці. Педагогу як і акцёру, на думку К.С. Станіслаўскага, неабходна адштурхоўвацца ня ад самаадчування і псіхічнага стану, мала падуладных волі і свядомасці, а ад логікі фізічных дзеянняў, якая пры правільным чытанні здольная выклікаць адпаведную логіку пачуццяў, і ўздзейнічаць на псіхіку чалавека. Дзеянне, якое разумеецца як адзінства фізічнага і псіхічнага, выключае асобнае развіццё ўнутраных ці знешніх элементаў паводзін педагога. Яшчэ адна агульная характарыстыка акцёра і педагога – працаздольнасць, якая характарызуе таленавітага чалавека. Талент, на думку Станіслаўскага, гэта шчаслівая камбінацыя многий творчых здольнасцяў чалавека ў злучэнні з воляй. Пры гэтым уменне заражаць навучэнцаў сваімі перажываннямі дэманструе праява таленту ў педагагічным працы. Станіслаўскі разглядаў заразлівасць акцёра як чароўнасць або сілу прыцягнення. Гэта «няўлоўнае ўласцівасць, невытлумачальная прывабнасць усяго істоты акцёра, у якога нават недахопы ператвараюцца ў годнасці, якія капіююцца яго прыхільнікамі і пераймальнікамі».

Важны кампанент педагагічнага і акцёрскага майстэрства – сіла пачуццяў і перажыванняў. Таму развіццё пачуццёвай сферы настаўніка харэаграфіі – адзін з важных элементаў яго майстэрства. Акрамя таго, неабходна своечасова пазбавіцца ад залішняй мышачнай заціснутасці, якая блакуе інтэлектуальную дзейнасць, таму адэкватнае сцэнічнае самаадчуванне неабходна і акцёру, і педагогу. У таленавітых педагогаў пакарае натуральнасць, грацыя, інтуіцыя, раўнавагу розуму і пачуццяў, каардынацыя словы і дзеянні. Яшчэ адзін агульны момант у педагагічнай і акцёрскай дзейнасці – заваёва ўвагі аўдыторыі. К.С. Станіслаўскі адзначыў стадыі працэсу зносін акцёра з аўдыторыяй:

– першая стадыя – выхад артыста на сцэну, які суправаджаецца

агульным арыентаваннем і выбарам аб'екта ўздзеяння;
– другая стадыя – прыцягненне ўвагі на сябе, падыход да аб'екта;
– трэцяя стадыя – зандаванне душы аб'екта шчупальцамі вачэй;
